ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 КРАСАВІКА 2018 г. ЧАЦВЕР № 65 (28681)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Сумка для жонкі дызайнера



У школе — чытаць



Не трапіць на вуду кіберзлачынцаў

# ХТО — КАГО?!



Беларускія асілкі Аляксандр Курак і Руслан Багіраў працягнулі на 20 метраў 9-тонны гоначны МАЗ. Акцыя прайшла ўчора ў Мінску ў падтрымку падапечных дабрачыннага фонду дапамогі дзецям «Белы бусел». Легендарны аўтамабіль належыць камандзе «МАЗ-СПОРТаўта», якая сёлета паказала высокі вынік на ралі-рэйдзе «Дакар-2018».

*На здымку:* Аляксандр КУРАК цягне МАЗ.

Фота БЕЛТА.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Сяргей КАВАЛЬЧУК, міністр спорту і турызму:**

*«Напярэдадні такой вялікай спартыўнай падзеі, як II Еўрапейскія гульні, якія пройдуць у нас у 2019 годзе, мы павінны паглядзець гатоўнасць у тым ліку і нашай турыстычнай галіны бізнесу: што можам прапанаваць людзям, якія прыедуць да нас. Госці будуць наведваць не толькі спартыўныя спаборніцтвы, але і захочуць пазнаёміцца з турыстычнымі магчымасцямі Беларусі. Да старту гульняў яшчэ ёсць час, каб падрыхтавацца да прыёму замежных турыстаў. Мы павінны зрабіць так, каб на годным узроўні маглі паказаць у кожным кутку краіны нашу культуру, прыгажосць беларускай прыроды».*

■ Навука для жыцця

# КОЖНАЯ ВЯСНА — РОЗНАЯ

## Так сцвярджаюць вучоныя ў сферы сельскай гаспадаркі

**Зараз усіх аграномаў і кіраўнікоў сельскагаспадарчых арганізацый хвалюе пытанне, калі падкормліваць азотнымі і калійнымі ўгнаеннямі азімыя збожжавыя культуры і шматгадовыя травы, у якіх дозах і формах. Спазніцца — значыць згубіць ураджайнасць, падкарміць зарана — страціць пэўную колькасць элементаў харчавання.**

Штогод Інстытут глебазнаўства і аграхіміі Нацыянальнай акадэміі навук дае аператыўныя рэкамендацыі аграрыям на гэты конт. «Кожны год вясна дорыць сюрпрызы. І кожны раз патрабуецца карэкціроўка рэкамендацый з улікам канкрэтных умоў надвор'я», — кажа **дырэктар інстытута, прафесар, доктар сельскагаспадарчых навук Віталій ЛАПА.**

СТАР. 4

Глуша Адамовіча

*«Звязда» працягвае друкаваць матэрыялы ў падтрымку адкрыцця ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна музея, прысвечанага творчасці Алеся Адамовіча.*

# Няпросты лёс

## Што чакае аўтэнтычны будынак аптэкі, які ў гады вайны стаў месцам падпольнага супраціўлення мірнага насельніцтва Глушы захопнікам?

**Нядаўна мы адзначалі трагічную 75-ю гадавіну Хатыні. Ёсць свая Хатынь і ў Магілёўскай вобласці — вёска Боркі Кіраўскага раёна. У 1942 годзе батальён Оскара Дырленвангера знішчыў 1800 жыхароў гэтай і навакольных вёсак. 13 гадоў таму тут быў узведзены мемарыяльны комплекс «Памяці спаленых вёсак». Яшчэ раней пра трагедыю падрабязна напісаў Алесь Адамовіч. «Акцыя застрашвання» ў Кіраўскім раёне стала асновай яго аповесці «Карнікі», а потым і фільма «Ідзі і глядзі», знятага Элемам Клімавым. Гэта дзякуючы Адамовічу мы сёння можам з дакументальнай дакладнасцю прасачыць хроніку таго крывавага дня. Ён паспеў захаваць для нас успаміны жывых сведак тых жахаў...**

### Вера без спраў — мёртвая

Ён стварыў яшчэ адзін літаратурны помнік мужнасці і бясстрашнасці землякам-падпольшчыкам: напісаў дылогію «Партызаны» — «Вайна пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой». Будынак аптэкі ў Глушы — сведка тых страшных дзён, калі наша краіна была пад акупацыяй, сведка гераічных учынкаў звычайных жыхароў пасёлка, якія нават пад страхам смерці не складалі зброю. Гэты дом сёння стаў індыкатарам нашага сумлення. Мы хочам яго захаваць, каб паказваць дзецям, унукам. Вучыць на яго прыкладзе патрыятызму, расказваць сапраўдную праўду пра вайну. Як кажуць, вера без спраў — мёртвая. Так і з музеем. Жаданне ствараць ёсць. І нічога больш. Няма заказчыка, не хапае грошай... Апошнім адчувальным унёскам у агульную скарбонку сталі ахвяраванні супрацоўнікаў Выдавецкага дома «Звязда». І вось ужо амаль год рахунак не папаўняецца.

Нядаўна ў «Звяздзе» прайшоў круглы стол на тэму захавання памяці «Аб чым званы Хатыні звоняць сёння?» Спецыялісты адзначылі, што зараз на нашых вачах у свеце адбываецца не проста рэвізія вынікаў апошняй сусветнай вайны, але і рэабілітацыя злачынных ідэалогій. А сённяшнія нашчадкі, якія жывуць у інтэрнэце, успрымаюць гэтую інфармацыю за чыстую манету. Калі на фоне гэтага чуеш, што прасцей будынак аптэкі ў Глушы знесці і пабудаваць пад музей новы, становіцца нават не па сабе. Навошта тады ў музеі ваеннай гісторыі ў Мінску экспануюцца абгарэлыя бярвёны і сельскагаспадарчыя прылады з Хатыні, калодзежны журавель з вёскі Літавец Дзяржынскага раёна, якая была спалена разам з жыхарамі ў студзені 1943 года? Дом у Глушы — жывая памяць. Не нейкі там навадзел. Нават скурай адчуваеш тыя гераічныя падзеі, што тут адбываліся. У ім яшчэ захавалася тая энергетыка. Гэтым ён і каштоўны. Чаго ж мы наогул вартыя, калі нават памяць пра гэта не здольныя захаваць?

СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X
18065>

■ Меркаванне

# СТВАРЫЦЬ ПРЫБЫТКОВЫЯ ЛАНЦУЖКІ

**Эфектыўнасць мяса-малочнай сферы стала адной з ключавых тэм семінара-нарады з удзелам Прэзідэнта аб развіцці сяла і аграпрамысловай сферы. Па яго выніках Міхаіл РУСЫ, намеснік прэм'ер-міністра, пракаментаваў зробленыя кіраўніком дзяржавы заўвагі.**

Па словах віцэ-прэм'ера, у Беларусі ўжо створана добрая матэрыяльна-тэхнічная база, умовы для пражывання работнікаў гаспадарак, для вытворчасці мяса-малочнай прадукцыі, якая выпускаецца і карыстаецца попытам на рынку. «Але сёння ўжо іншыя патрабаванні і падыходы. У існуючым тэхналагічным ланцужку сусветных рынкаў патрэбна канкурэнтаздольная прадукцыя з высокім маржынальным коштам», — падкрэсліў ён.

Адсюль і пытанне: як варта працаваць з малочнатаварнымі кампаніямі, якім чынам атрымаць найбольшы прыбытак? «Навука паказвае, што менавіта ланцужок «вырабіў — перапрацаваў — рэалізаваў» — гэта самы эфектыўны шлях эканамічнай устойлівасці. А гэта ў сваім родзе агракамбінаты, холдынгі. Таму і стаіць пытанне, што трэба ствараць новыя вертыкальна інтэграваныя аб'яднанні», — сказаў Міхаіл Русы.

Асобна Аляксандр Лукашэнка закрануў тэму адказнасці старшынь райвыканкамаў за тое, што асобныя гаспадаркі не могуць выйсці на прыбытковы ўзровень. Намеснік прэм'ер-міністра пацвердзіў, што праблемы тут сапраўды ёсць. Ён падкрэсліў, што ў такім выпадку правільна ставіць задачу для дасягнення такімі гаспадаркамі сярэдняга заробку ў 1000 рублёў. «Праз зарплату мы выходзім на тое, што варта вырабіць, які аб'ём, як прадаць, каб выплаціць патрэбную зарплату», — кажа віцэ-прэм'ер.

Адсюль становіцца неабходным не толькі вырабляць, але і рабіць прадукцыю максімальна рэнтабельнай. Толькі варта ўсё максімальна пралічыць і спланаваць.

**Вераніка ПУСТАВІТ**

■

## РАЗАМ ВЫРАШАЕМ ПРАБЛЕМЫ

**Надыход святочных дзён не стане прычынай адмены прамых тэлефонных ліній, якія ўжо даўно сталі традыцыйнымі. У суботу, 7 красавіка, у Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах яны адбудуцца, як заўсёды, з 9.00 да 12.00. На сувязь выйдуць:**

першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Мікалай Васілевіч ТОКАР. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Уладзіміравіч ГАРБАЧОЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

першы намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Іван Алёйзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

першы намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Алег Іванавіч ЧЫКІДА. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Алег Альфрэдавіч ПЛАЎСКІ. Тэл. 8 017 500 41 60;

старшыня МІНСКАГА гарадскога Савета дэпутатаў Васіль Васілевіч ПАНАСЮК. Тэл. 8 017 222 44 44.

# СПРАВЫ МІЖНАРОДНЫЯ

## «Высылкамі дыпламатаў пытанне не вырашыш»

**Такое меркаванне наконт атручвання Скрыпаля выказаў на брыфінгу начальнік упраўлення інфармацыі і лічбавай дыпламатыі — прэс-сакратар МЗС Беларусі Дзмітрый МІРОНЧЫК.**

Нагадаем, у пачатку сакавіка ў англійскім горадзе Солсберы былі атручаны былы расійскі афіцэр Сяргей Скрыпаль і яго дачка Юлія. Здарэнне звязалі з Расіяй, некаторыя краіны сталі адкліканы сваіх дыпламатычных прадстаўнікоў з яе тэрыторыі.

— Наш міністр ужо дакладна выказаўся па гэтым пытанні. Любое абвастрэнне сітуацыі ў рэгіёне катэгарычна нявыгадна Беларусі, — адзначыў Дзмітрый Міронччык. — Мы вельмі занепакоеныя магчымым ужываннем нервова-паралітычнага рэчыва ў Солсберы. Беларусь была і застаецца катэгарычным праціўнікам прымянення хімічнай зброі. Вінаватыя ў такіх злачынствах павінны прыцягвацца да адказнасці.

Аднак спачатку гэтых вінаватых трэба адназначна і дакладна выявіць, падкрэсліў прэс-сакратар МЗС. Паводле яго слоў, толькі аўтарытэтнае і адкрытае расследаванне з удзелам усіх зацікаўленых бакоў пры поўнай адпаведнасці з законамі дасць інфармацыю, на падставе якой можна будзе рабіць аб'ектыўныя высновы.

— Высылкамі дыпламатаў пытанне не вырашыш, — дадаў ён. — У рэшце рэшт, менавіта гэтыя людзі павінны дамаўляцца, знаходзіць выйсце з крызісных сітуацый, уключаючы гэтую.

Дзмітрый Міронччык таксама расказаў пра тое, як развіваецца сітуацыя з узаемным прызнаннем віз з Расіяй.

— Ідзе нармальны перагаворны працэс. Ёсць блізкія пазіцыі. Пытанні, па якіх мы пакуль разыходзімся, абмяркоўваюцца на ўзроўні краін зацікаўленымі ведамствамі, — сказаў ён. — Як толькі расійскі бок скаардынуе міжведамасныя падыходы, адбудзецца чарговы раўнд перагавораў, мы гатовыя.

Акрамя таго, прэс-сакратар МЗС адзначыў, што пасольства Беларусі ў Кіеве працягвае старанна адсочваць сітуацыю з беларускім грамадзянінам Юрыем Палітыкай, які абвінавачваецца ў шпіянажы. Паводле яго слоў, пакуль да разгляду пытання па сутнасці не дайшло, паколькі 27 сакавіка на так званым падрыхтоўчым судовым пасяджэнні было прынята рашэнне аб яго пераносе на 5 красавіка ў сувязі з адсутнасцю перакладчыка з украінскай мовы.

— Як паведамляла наша пасольства, наш грамадзянін не выказвае якіх-небудзь скаргаў, у тым ліку на ўмовы ўтрымання. Мы працягнем займацца гэтай справай, — дадаў Дзмітрый Міронччык.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

■ Улада на сувязі

# Працаўладкаванне, дарогі і... шумная кавярня

## Што хвалюе жыхароў Віцебшчыны?



**На прамую лінію з губернатарам Віцебшчыны Мікалаем ШАРСНЁВЫМ патэлефанавала каля дваццаці чалавек. Калі раней, як той казаў, тэлефон не змаўкаў, гэтым разам паміж званкамі некалькі разоў былі паўзы.**

Першай пагутарыла са старшынёй аблвыканкама жыхарка Віцебска. Яна расказала пра некалькі праблем. У прыватнасці, прасіла дапамагчы пляменніку з Полацкага раёна вырашыць жыллёвае пытанне, а таксама дапамагчы з працаўладкаваннем сваяка. І яшчэ расказала пра факты продажу на Полаччыне нелегальнага алкаголю. Разбяруцца ва ўсім.

Тэму працаўладкавання працягнуў тэлефонны званок ад 28-гадовага інваліда трэцяй працоўнай групы з Дубровеншчыны. Ён пацікавіўся, як пры пенсіі ў 150 рублёў аплачваць вялікую запазычанасць за камунальныя паслугі. Растлумачылі, што палова пенсіі штомесяц прымусова пералічваецца на рахунак арганізацыі ЖКГ. Мікалай Шарснёў параіў пайсці працаваць. І даручыў кіраўніку мясцовай улады паспрыяць у працаўладкаванні.

Да параўнання: калі папярэдні хлопец не вельмі імкнецца да работы, то 77-гадовая жыхарка Оршы, наадварот, хацела б працаўладкавацца, аб чым яна расказала кіраўніку вобласці. Але ж ці можа ўлада дапамагчы?

Жанчына з Віцебска расказала губернатару аб установе грамадскага харчавання на першым паверсе жылога дома. Скардзілася на пахі з-за таго, што смажаць шашлыкі. Паскардзілася і на шум ад работы сістэмы вентыляцыі. Дарэчы, жыхары гэтага ж дома раней па іншых пытаннях звярталіся да адказных асоб, каб кавярня не перашкаджала ім жыць спакойна. Як кажуць у народзе, прыходзілі «камісіі». І прадстаўнікі фірмы, якой належыць кафэ, выпраўлялі недахопы. Але ўсё роўна засталіся незадаволеныя. Як адзначыў мэр горада, з якім звязаліся падчас прамой лініі, размова ідзе пра жыльцоў некалькіх кватэр. Губернатар даручыў адказным службам канчаткова разабрацца з пытаннем.

Жыхарка Чашніцкага раёна расказала пра дрэнны стан сельскай дарогі. Старшыня райвыканкама ў курсе. І пацвердзіў, што зямлячка мае рацыю. Пастараюцца зрабіць так, каб у вяскоўцаў больш не было падстаў скардзіцца — дарогу адрамантуюць.

Прамая тэлефонная лінія доўжылася тры гадзіны. Ва ўсіх пытаннях абавязкова ўважліва разбяруцца. І, калі ёсць законныя падставы, заяўнікам пойдуць насустрач.

Старшыня аблвыканкама яшчэ раз акцэнтаваў увагу падначаленых на неабходнасці быць бліжэй да людзей. Звярнуў увагу, што так робіцца ў раёнах з невялікай колькасцю насельніцтва. Напрыклад, у Расонскім, дзе мясцовая ўлада самастойна вырашае праблемы. Так і павінна быць. А ад жыхароў Віцебска, Полацка, Оршы, Талачына зваротаў паратўнальна няма многа.

Дарэчы, у першым квартале ў аблвыканкам паступіла 136 зваротаў. Гэта, у параўнанні з мінулым годам, менш на 24 %, а з 2016-м — на 50 %. Палова зваротаў — па тэме жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## ТРАМП ПАЦВЕРДЗІЎ СВОЙ НАМЕР ВЫВЕСЦІ ВОЙСКІ ЗША З СІРЫІ

**Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп пацвердзіў, што выступае за хутчэйшы вывад амерыканскіх войскаў з Сірыі, паведамляе ТАСС.**

«Я хачу сысці адтуль, хачу вярнуць салдат дадому, хачу пачаць аднаўляць нашу краіну», — сказаў ён. «Наша галоўная місія — пазбавіцца ад Ісламскай дзяржавы. Мы практычна справіліся з гэтай задачай, і мы прымем рашэнне вельмі хутка пры ўзаемадзеянні з іншымі краінамі ў рэгіёне», — дадаў Дональд Трамп.

Па словах амерыканскага прэзідэнта, за апошнія 17 гадоў ЗША патрацілі на Блізкім Усходзе $7 трлн, не атрымаўшы нічога ўзамен, акрамя «смерцяў і разбурэнняў». Паводле даных Пентагона, цяпер у Сірыі знаходзіцца каля 2 тысяч амерыканскіх ваенных.

Між тым спецпрадстаўнік прэзідэнта ЗША Брэт Макгурк паведаміў, што ЗША пакуль не прынялі канчатковага рашэння адносна выдзялення Сірыі $200 млн на аднаўленне краіны пасля канфлікту. «Прэзідэнт выразна даў нам зразумець, што ўсё, што мы робім (па Сірыі), павінна быць падвергнута ацэнцы, асабліва гэта датычыцца грошай амерыканскіх падаткаплацельшчыкаў, якія мы трацім. Мы праводзім ацэнку на рэгулярнай аснове, у тым ліку мы разглядаем гэтыя $200 млн — як іх можна патраціць найбольш эфектыўна», — сказаў ён.

## КОЛЬКАСЦЬ ПАЦЯРПЕЛЫХ ПРЫ МАСАВЫМ АТРУЧЭННІ Ў КЫРГЫЗСТАНЕ ДАСЯГНУЛА 249 ЧАЛАВЕК

**Пасля масавага атручэння ў рэстаране ў Бішкеку па медыцынскую дапамогу звярнуліся 204 чалавекі, 138 з іх былі шпіталізаваны ў Рэспубліканскую інфекцыйную бальніцу. Астатнія пацярпелыя праходзяць амбулаторнае лячэнне.**

У лячэбныя ўстановы Чуйскай, Ісык-Кульскай і Нарынскай абласцей звярнуліся па медыцынскую дапамогу яшчэ 45 пацярпелых, з іх 36 чалавек былі шпіталізаваны. Раней паведамлялася пра 222 пацярпелых. Усе пацярпелыя прымалі ўдзел у вясельных урачыстасцях у бішкекскім рэстаране «Ала-Тоа». Зараз праводзяцца лабараторныя даследаванні канфіскаваных у ім прадуктаў. Як мяркуецца, прычынай масавага атручэння маглі стаць стравы з курыцы ці рыбы.

Па гэтым факце распачата справа, рэстаран часова закрыты.

## У КРАМЛІ ЧАКАЮЦЬ ВЫБАЧЭННЯЎ АД ТЭРЭЗЫ МЭЙ І БАРЫСА ДЖОНСАНА З-ЗА «СПРАВЫ СКРЫПАЛЯ»

**Прэс-сакратар прэзідэнта Расіі Дзмітрый Пяскоў сказаў аб тым, што прэм'ер-міністру Вялікабрытаніі Тэрэзе Мэй і міністру замежных спраў каралеўства Барысу Джонсану прыйдзецца прыносіць прабачэнні Расіі з-за сітуацыі вакол «справы Скрыпаля», перадае агенцтва «Інтэрфакс». Ён падкрэсліў, што «тэорыя» Лондана ў любым выпадку не пацвердзіцца.**



«Расійскі бок з самага пачатку сказаў, што не мае дачынення да інцыдэнту ў Солсберы. А вось міністру замежных спраў Вялікабрытаніі, які абвінавачваў прэзідэнта Пуціна, прэм'ер-міністру Вялікабрытаніі нейк трэба будзе глядзець у вочы сваім калегам па ЕС, якім яны нешта расказвалі. І нейкім чынам трэба будзе прыносіць прабачэнні расійскаму боку», — падкрэсліў ён.

Пяскоў таксама адзначыў, што з самага пачатку расследавання сітуацыя была «цалкам жахлівая». Прэс-сакратар Пуціна назваў абвінавачанні Лондана ў адрас Крамля ў датычнасці да хіматакі ў Солсберы «вар'яцкімі».

Раней прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін па выніках перагавораў са сваім турэцкім калегам Рэджэпам Эрдаганам у Анкары выказаў надзею на тое, што на сесіі Міжнароднай арганізацыі па забароне хімічнай зброі (АЗХЗ) 4 красавіка ў «справе Скрыпаля» будзе пастаўлена кропка.

■ Тэхналогіі

# ПАГРОЗЫ ЛІЧБАВАЙ ЭКАНОМІЦЫ

**Эксперты адзначаюць высокую ступень пранікнення інфармацыйных тэхналогій у ключавыя галіны эканомікі Беларусі. Для краіны становіцца актуальным сачыць за трэндамі ў інфармацыйнай бяспецы. У 2017 годзе сусветная кіберзлачыннасць выглядала наступным чынам: зламыснікі вымагалі грошы праз шыфраванне даных, правяралі на трываласць крыптавалюту, шукалі ўразлівыя месцы банкаў.**

### Шыфравальшчыкі зрабілі год

Паводле даных кампаніі Positive Technologies, летась самымі частымі аб'ектамі нападаў былі інфраструктура і вэб-рэсурсы. Адным з галоўных сусветных трэндаў сталі шыфравальшчыкі — праграмы, якія кадзіравалі даныя карыстальнікаў і вымагалі грошы за расшыфроўку. У 2017 годзе эксперты кампаніі зафіксавалі на 13 % больш унікальных кіберзлачынстваў у параўнанні з 2016 годам. У мінулым годзе павялічвалася і колькасць ахвяр сярод звычайных карыстальнікаў — на іх былі нацэлены 26 % усіх кібератак. Асноўнымі матывамі зламыснікаў застаюцца атрыманне прамой фінансавай выгады (70 %) і крадзеж даных (26 %).

«Летась эксперты фіксавалі накіраваную на кампаніі Беларусі актыўнасць групоўкі Cobalt, якая спецыялізуецца на атаках фінансавых арганізацый. Менавіта яна, як мяркуецца, стаіць за крадзяжом больш як 1,8 млрд рублёў з рахункаў расійскіх банкаў у 2015—2016 гадах. Таксама за паспяховай атакай на банк з вывадам грошай за мяжу праз міжнародную сістэму SWIFT у 2017 годзе», — адзначыла кіраўнік аддзела прасоўвання і развіцця тэхналогій Positive Technologies Яўгенія Красавіна.

### Бяспека банкаў і крыптавалют

Яшчэ адным трэндам кібератак мінулага года сталі крыптавалюты і ICO. Па даных кампаніі, у кожным праекце ICO ў сярэднім знаходзілася па пяць слабых месцаў. Любое ўразлівае месца ў бяспецы смарт-кантракта прыводзіць да страты сродкаў або да немагчымасці правядзення аперацый, а таксама да адсутнасці магчымасці рэакцыі на інцыдэнт або аператыўную ліквідацыю «пралому».

Таксама адной з галоўных мэт кібератак нязменна застаецца банкаўская галіна. Па даных экспертаў, амаль у кожнай другой банкаўскай мабільнай праграме знаходзілі хоць бы адно крытычнае ўразлівае месца, якое дазваляла б зламыснікам праводзіць ашуканскія аперацыі. Толькі 8 % даследаваных мабільных банкаўскіх праграм мелі прымальны ўзровень бяспекі. Аналіз абароненасці анлайн-банкаў паказаў рост сярэдняй колькасці ўразлівых месцаў на 16 % у параўнанні з 2016 годам. Найбольш распаўсюджаная праблема абароненасці анлайн-банкаў — доступ да звестак, якія складаюць банкаўскую таямніцу кліентаў. У сферу інтарэсаў зламыснікаў таксама ўваходзяць банкаматы.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

■ Абітурыент-2018

# ШЭСЦЬ ДЗЁН

## на выбар спецыяльнасці і ВНУ

**Пастановай Міністэрства адукацыі вызначаны тэрміны правядзення ўступнай кампаніі ва ўстановах вышэйшай адукацыі.**

Прыёмныя камісіі будуць прымаць дакументы **з 12 па 17 ліпеня**. У гэтыя тэрміны вызначыцца з выбарам спецыяльнасці павінны ўсе абітурыенты, якія прэтэндуюць на бюджэтныя месцы, а таксама абітурыенты, якія паступаюць на платную форму навучання на спецыяльнасці, дзе прадугледжаны ўступныя іспыты.

Ад абітурыентаў, якія паступаюць на платнай аснове, але не здаюць уступныя экзамены ў ВНУ, дакументы будуць прымаца:

**з 12 па 31 ліпеня** — у Акадэміі МУС, Магілёўскім інстытуце МУС, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС;

**з 12 ліпеня па 2 жніўня** — у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў;

**з 12 ліпеня па 4 жніўня** — ва ўсіх іншых установах вышэйшай адукацыі.

Тэрміны падачы дакументаў для выпускнікоў профільных класаў педагагічнай накіраванасці, якія паступаюць на педагагічныя спецыяльнасці пасля праходжання гутаркі, — з 12 па 14 ліпеня (як для асоб, якія паступаюць на «бюджэт», так і на платнай аснове).

А **з 18 ліпеня** распачынаюцца ўступныя выпрабаванні, якія праводзяцца непасрэдна ва ўстановах адукацыі. Маюцца на ўвазе экзамены па творчасці, фізічнай культуры, а таксама экзамены для абітурыентаў, якія паступаюць на аснове сярэдняй спецыяльнай адукацыі на скарочаныя тэрміны навучання. Уступныя іспыты арганізаваны толькі ў адну сесію: як для асоб, што паступаюць за кошт сродкаў бюджэту, так і на платнай аснове.

Уступныя выпрабаванні пройдуць у наступныя тэрміны:

**з 18 па 21 ліпеня** — у Акадэміі МУС, Магілёўскім інстытуце МУС, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС;

**з 18 па 26 ліпеня** — у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў;

**з 18 па 24 ліпеня** — у іншых ВНУ.

**з 18 па 25 ліпеня** ў ВНУ сельскагаспадарчага профілю пры паступленні на дзённую форму навучання.

Тэрміны залічэння на «бюджэт» наступныя: па 24 ліпеня — у ВНУ сілавых ведамстваў, па 28 ліпеня — у творчых, сельскагаспадарчых і іншых ВНУ.

Прыём дакументаў на вакантныя бюджэтныя месцы ў рамках дадатковага набору будзе весціся ў ВНУ сілавых ведамстваў з 26 па 28 ліпеня (залічэнне па 30 ліпеня), у творчых ВНУ — з 30 па 31 ліпеня (залічэнне па 1 жніўня) і ў іншых ВНУ — з 30 ліпеня па 1 жніўня (залічэнне па 3 жніўня).

Тэрміны залічэння на платную форму навучання ў ВНУ сілавых ведамстваў — па 2 жніўня, у творчых ВНУ — па 3 жніўня, у іншых ВНУ (акрамя завочнай формы навучання ў сельскагаспадарчых ВНУ) — па 6 жніўня.

Нагадаем, што выпускныя вечары адшумяць у школах 9 і 10 чэрвеня, а цэнтралізаванае тэсціраванне стартуе 12 чэрвеня.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Будзь у курсе!

# Ну як пасажыру без разеткі ў вагоне?

## БЧ укараняе новую паслугу для ўладальнікаў гаджэтаў

**Вядома, што з кожным годам расце колькасць электронных мабільных прылад, з якімі пасажыры не расстаюцца нават у дарозе. З улікам гэтага трэнду пачынаючы з 2008 года Беларуская чыгунка закупляе вагоны, электра- і дызель-цягнікі, абсталяваныя разеткамі для пасажыраў з напружаннем 220V. За мінулыя 10 гадоў ва ўсіх новых вагонах, а таксама ў тых, што прайшлі капітальна-аднаўленчы рамонт, стала магчымым скарыстацца бясплатнай падзарадкай мабільных прылад.**

У той жа час, расказалі ў прэс-службе магістралі, паколькі нарматыўны тэрмін службы пасажырскага вагона складае 28 гадоў, на Беларускай чыгунцы эксплуатуецца даволі шмат вагонаў выпуску раней за 2008 год, дзе пасажырам недаступныя разеткі 220V.

А яны якраз неаднаразова выказваліся аб патрэбнасці ў зарадцы сотавых тэлефонаў і іншых мабільных прылад у дарозе (у тым ліку падчас «Адзіных дзён пасажыра», пры анкетаванні на сайце і ў цягніках). Прымаючы пад увагу запатрабаванні кліентаў, для вагонаў, не абсталяваных разеткамі, было выпрацавана альтэрнатыўнае рашэнне.

На базе Магілёўскага вагоннага ўчастка ў цягніках № 371/372 Магілёў — Львоў,



№ 613/614 Магілёў — Салігорск, № 649/650 Магілёў — Брэст і № 659/660 Магілёў — Мінск у 2017 годзе быў рэалізаваны пілотны праект па ўкараненні новай паслугі «Падзарадка персанальных электронных прылад». Для гэтага ў начальніка цягніка ёсць універсальная мабільная зарадная прылада тыпу PowerBank, якая выдаецца па заказах пасажыраў. Інфармацыя пра паслугу распаўсюджваецца шляхам галасавых аб'яў, а таксама размешчана ў вагонах у пераліку платных паслуг. Яе кошт разлічваецца кожным вагонным участкам у адпаведнасці з заканадаўствам.

Аб запатрабаванасці і станоўчай ацэнцы дадзенай паслугі пасажырамі кажа той факт, што ў 2017 годзе падчас правядзення пілотнага праекта магчымасцю падзарадкі персанальных прылад скарысталася 1090 чалавек. У цяперашні час вядзецца работа па ўкараненні гэтай паслугі па ўсіх цягніках Беларускай чыгункі, дзе ёсць вагоны, не абсталяваныя разеткамі.

❍ У ТЭМУ

**У сувязі з пераносамі ў красавіку рабочых дзён прызначаны дадатковыя цягнікі міжрэгіянальных ліній, паведамілі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі.**

Так, у перыяд вялікіх красавіцкіх выхадных, звязаных з Радаўніцай, з 14 да 18 красавіка будуць курсіраваць дадатковыя цягнікі ў зносінах Мінск—Гомель—Мінск, Мінск—Брэст—Мінск, Мінск—Віцебск—Мінск і Мінск—Пінск—Мінск. Таксама ў раскладзе ўлічаны перанос выхадных у канцы месяца. 28 і 29 красавіка прызначаны дадатковыя цягнікі, якія звяжуць сталіцу з Брэстам, Віцебскам, Гомелем і Пінскам.

Акрамя таго, з 27 да 29 красавіка па тэрыторыі Беларусі транзітам будуць курсіраваць дадатковыя міжнародныя цягнікі № 559 Адлер—Калінінград, № 239 Санкт-Пецярбург—Бранск, № 221 Масква—Брэст і № 222 Брэст—Смаленск.

Сяргей РАСОЛЬКА

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

### КЛЯШЧОЎ СЁЛЕТА СТАЛА МЕНШ

**З надыходам цяпла актывізаваліся крывасмокі нашых лясоў і палёў — кляшчы. У сакавіку на Брэстчыне зафіксавана 14 выпадкаў укусаў, шасцёра сярод пацярпелых — дзеці. Кляшчы кусалі людзей у Брэсцкім, Іванаўскім, Кобрынскім, Маларыцкім, Пінскім, Пружанскім раёнах.**

Гэта здаралася як у лесе, так і на прыватных падворках, а таксама пры выгуле сабак. На дзяцей крывасмокі ў асноўным нападалі, калі тыя гулялі з хатнімі жывёламі. Але прыведзеныя **ўрачом-энтамолагам абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ларысай ЯРАЦ** лічбы нашмат меншыя, чым былі ў гэты час летась. У мінулым годзе за першы квартал пацярпела 73 чалавекі, з іх 28 дзяцей. Значыць, сакавіцкія маразы паўплывалі на папуляцыю насякомага.

Пра гэта сведчаць і вынікі даследавання, якое правялі спецыялісты на так званым клешчавым стацыянары Чырвоны Двор пад Брэстам. У пачатку месяца там не знайшлі ніводнага насякомага на ўмоўную адзінку адлегласці — флагакіламетр, у сярэдзіне месяца заўважана 11 экзэмпляраў, у канцы месяца — 8 кляшчоў. Летась паказчыкі колькасці былі такія: 6, 59 і 40 экзэмпляраў.

— Кляшчоў паменшала, але страчваць пільнасць з гэтай нагоды нельга, — папярэджвае **начальнік аддзела эпідэміялогіі названага цэнтра Алена ПАДУШКІНА**. — У паловы крывасмокаў, якія былі абследаваныя лабараторыяй, знойдзены ўзбуджальнікі лайм-барэліёзу. Таму трэба выконваць неабходныя меры бяспекі, клапаціцца пра шчыльнае адзенне, асабліва пры наведванні лесу.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

### ДВОРНІК ПАШКОДЗІЎ АЎТО, ЯКОЕ ЯМУ ПЕРАШКАДЖАЛА

**У аператыўна-дзяжурную службу Маскоўскага РУУС г. Мінска паступіла паведамленне, што па вуліцы Напалеона Орды дворнік пашкодзіў аўтамабіль, прыпаркаваны каля пад'езда жылога дома.**

Пацярпелы пачуў гукі ўдараў і, пагледзеўшы ў акно, убачыў, як мужчына ў спецадзенні работніка ЖЭСа спачатку нагой, а затым смеццевым кантэйнерам б'е яго машыну. Пазней супрацоўнікам крымінальнага вышуку грамадзянін растлумачыў, што яго раздражняла тое, што жыльцы дома рэгулярна паркуюць свае аўтамабілі каля пад'езда, перашкаджаючы тым самым вывазу бытавога смецця. Па інфармацыі Маскоўскага РУУС сталіцы, на момант здзяйснення хуліганства мужчына знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення. У яго крыві выяўлена больш за тры праміле алкаголю. У выніку здарэння аўтамабіль атрымаў пашкоджанні лакафарбавага пакрыцця на крыле, заднім бамперы і крышцы багажніка. Таксама было разбіта шкло ззаду машыны. Устаноўлена, што 38-гадовы мужчына сапраўды працуе дворнікам жыллёва-эксплуатацыйнай службы. Раней ён прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за хуліганства. Цяпер грамадзянін за свой учынак можа быць пакараны пазбаўленнем волі на тэрмін да трох гадоў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

### ПАД МІНСКАМ ЗАГІНУЎ САЛДАТ

**Учора ў агнявым гарадку 120-й асобнай механізаванай брыгады праходзілі планавыя заняткі па агнявой падрыхтоўцы.**

Салдаты тэрміновай службы, якія ўваходзілі ў экіпаж адной з БМП, груба парушылі меры бяспекі падчас узбраення баявых машын. Прагрымеў стрэл. Адзін з членаў экіпажа, старшы механік-кіроўца БМП радавы Дзмітрый Удод, атрымаў раненне, ад якога памёр.

— Следчы камітэт праводзіць неабходныя дзеянні, — паведамілі ў прэс-службе Міністэрства абароны. — Створана спецыяльная камісія ад ваеннага ведамства на чале з намеснікам міністра, якая будзе расследаваць абставіны і прычыны здарэння.

Ведамства выказвае глыбокія спачуванні родным і блізкім Дзмітрыя Удода. Яно акажа ўсю патрэбную дапамогу і падтрымку.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

# КОЖНАЯ ВЯСНА — РОЗНАЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## СЕЛЕКЦЫЯ ДЛЯ СЯБЕ І НА ЭКСПАРТ

У сельскай гаспадарцы айчынныя вучоныя працуюць у звязцы з вытворцамі. Дзякуючы ім, калі прыгадаць вядомую цытату Шымона Перэса пра ролю навукі, у нашай краіне не проста гарантавана харчовая бяспека. Апошнія 12 гадоў ураджайнасць збожжавых штогод прыбаўляе па 1,4—1,5 ц/га, а валавы збор — па 300—360 тысяч тон. У 2018 годзе ўрадам пастаўлена задача атрымаць не менш за 8,32 млн тон збожжа, 1,18 млн тон бульбы, 4,9 млн тон цукровых буракоў, 180 тыс. тон ільнотрасты і 780 тыс. тон алейнага насення рапсу. Без дапамогі навукі гэту задачу, як і захаванне станоўчых тэндэнцый у галіне, не выканаць, упэўнены **намеснік генеральнага дырэктара Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па земляробстве, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар сельскагаспадарчых навук Эрома УРБАН.**

Вучоныя працуюць над аптымізацыяй структуры пасяўных плошчаў, распрацоўкай энергазберагальных тэхналогій апрацоўкі глебы, стварэннем сістэмы адаптыўных, узаемадапаўняльных сартоў, сістэмы павышэння ўрадлівасці глебы і рацыянальнага выкарыстання ўгнаенняў, а таксама інтэграванай сістэмы абароны раслін.

Навукова-практычны цэнтр праводзіць селекцыю па 42 сельскагаспадарчых культурах: усе збожжавыя (жыта, пшаніца, ячмень, трыцікале, авёс), алейныя (рапс, гарчыца, свірэпа), па 20 відах шматгадовых бабовых злакавых траў, зернебабовых (лубін, гарох, віка) і крупяных (грэчка і проса).

З 1965 года селекцыянеры цэнтра (у розныя гады ён меў розныя назвы і падпарадкаванасць) стварылі 382 сарты раслін, у тым ліку за перыяд сваёй найноўшай гісторыі, з 2006 года, — 201 сорт. Цяпер 240 айчынных сартоў займаюць 80 % пасяўных плошчаў сельскагаспадарчых культур Беларусі, 80 уключаны ў рэестры насення бліжняга і далёкага замежжа і высяваюцца на плошчы каля 3 млн га. Зусім нядаўна чатыры новыя разнавіднасці жыта, трыцікале і грэчкі, створаныя вучонымі цэнтра, былі ўключаныя ў дзяржаўны рэестр Расійскай Федэрацыі на гэты год.

Ёсць заслуга Цэнтра па земляробстве і ў тым, што апошнія 15 гадоў Беларусь нарыхтоўвае неабходныя 150 тысяч тон сыравіны для піваварнай галіны. 67 % палёў нашай краіны, на якіх расце піваварны ячмень, займаюць сарты, выведзеныя ў цэнтры.

Апошнія гады вучоныя вялікую ўвагу ўдзяляюць бялковым культурам для збалансавання кармоў для жывёлы, каб знізіць іх імпарт. Асноўнай алейнай бялковай культурай у Беларусі з'яўляецца рапс. Пачынаючы з 2005 года, пасяўныя плошчы пад ім павялічыліся са 128 да 326,3 тыс. га, амаль удвая ўзрасла ўраджайнасць, валавы збор алейнага насення павялічыўся амаль у сем разоў. На рапсавым полі Беларусі цяпер больш за 90 % займаюць сарты беларускай селекцыі, 12 сартоў уключаны ў рэестр Расійскай Федэрацыі.

## МЫ ЁСЦЬ ТОЕ, ЧЫМ ХАРЧУЮЦЦА РАСЛІНЫ

Акрамя штогадовых аператыўных рэкамендацый аграрыям па аптымальным унясенні ўгнаенняў, даччынае прадпрыемства Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па земляробстве Інстытут глебазнаўства і аграхіміі займаецца доўгатэрміновымі праектамі: распрацоўвае комплекс мер па захаванні і павышэнні ўрадлівасці глебы і абароне яе ад дэградацыі.

Дзве важныя распрацоўкі інстытута — кадастравая ацэнка зямлі (сумесна з праектным інстытутам Белдзіпразем) і буйнамаштабнае аграхімічнае даследаванне глебы. Акрамя таго, інстытут ажыццяўляе метадычнае кіраўніцтва работамі па вапнаванні кіслай глебы. «Калі кіслотнасць глебы не аптымізаваная, аддача ад мінеральных угнаенняў будзе нізкая», — растлумачыў дырэктар інстытута Віталій Лапа.

**«Калі гаспадарка жадае займацца бульбай, то плошча пасадкі павінна быць не менш за 200 га. У сучасных умовах толькі ў гэтым выпадку мы можам забяспечыць прымальны сабекошт».**

Аграхімікі вядуць таксама пастаянную работу па распрацоўцы новых формаў макра- і мікраўгнаенняў. «Нашымі вучонымі распрацаваны поўны асартымент — 84 новыя формы комплексных угнаенняў. Акрамя таго, мы распрацоўваем комплексныя вадкія хелатныя мікраўгнаенні. Мікраэлементы — вельмі важны кірунак, бо на іх бедныя ворныя землі Беларусі. Размова ідзе не толькі пра селен і кобальт, якія неабходныя для здароўя чалавека і жывёл, але і пра медзь, цынк, марганец, якія ўплываюць на якасць прадукцыі і ўраджайнасць. Мы распрацавалі 20 формаў такіх мікраўгнаенняў», — кажа прафесар Лапа.

Інстытут глебазнаўства і аграхіміі штогод разлічвае патрэбнасць беларускай сельскай гаспадаркі ў мінеральных угнаеннях на ўвесь каляндарны год з улікам запланаваных ураджайнасці, аб'ёму валавой прадукцыі і з улікам фактычнага стану ўрадлівасці глебы.

Сярод кірункаў работы інстытута таксама — эфектыўнае выкарыстанне арганічных угнаенняў і арганічнае земляробства.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЧАСАМ — ХАЛАДНАВАТЫЯ ТРОПІКІ

У Беларусі ёсць тэрыторыі, дзе для эфектыўнай сельскай гаспадаркі неабходна праводзіць вялікія папярэднія работы. Справа ў тым, што наша краіна адносіцца да гумiднай зоны — для яе характэрная залішняя вільготнасць, пры гэтым яна не пастаянная, а ўзнікае перыядычна, падчас веснавой і летняй паводак.

«Водны рэжым з'яўляецца адным з фактараў, якія ўплываюць на ўраджайнасць і які можа рэгулявацца чалавекам, — расказаў **дырэктар Інстытута меліярацыі Мікалай ВАХОНІН, кандыдат тэхнічных навук.** — Шматгадовыя вопыты паказалі, што ўраджайнасць траў на сена ў балоце не перавышае 12—14 ц/га, а ў выніку асушэння складае ад 60 да 120 ц/га. У Беларусі да меліярацыі мелася каля 5 млн га зямель, дзе весці сельскую гаспадарку было немагчыма з-за вялікай вільготнасці» .

На сённяшні дзень Інстытут меліярацыі, таксама даччынае прадпрыемства Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па земляробстве, ажыццяўляе навуковае забеспячэнне выкарыстання больш як 4,5 млн га сельскагаспадарчых зямель. Пры гэтым новае асушэнне не праводзіцца, асноўная задача, якую вырашаюць вучоныя ў нашы дні, — захаванне і выкарыстанне раней меліяраваных зямель. Згодна з апошняй інвентарызацыяй, рэканструкцыя меліярацыйных сістэм патрабуецца на плошчы 356 тыс. га.

Пра тое, наколькі важна не запускаць догляд за асушальнымі сістэмамі, сведчаць наступныя лічбы: падтрымка іх у працаздольным стане патрабуе ўкладанняў у памеры 20—25 долараў на гектар; аднак калі гэтага не рабіць, то на капітальны рамонт спатрэбіцца сумы ў памеры 200—250 долараў на гектар, а на рэканструкцыю — 1000—2000 долараў.

Інстытут меліярацыі распрацоўвае і новыя матэрыялы, тэхналогіі і рашэнні, якія арыентаваны на дасягненне максімальнага прыбытку з поля, а не максімальнай ураджайнасці любой цаной. «Мы распрацавалі прылады па дыягностыцы канструкцый, якія дазваляюць праводзіць работы толькі там, дзе гэта неабходна» , — прывёў прыклад дырэктар.

Акрамя таго, супрацоўнікі інстытута стварылі Аўтаматызаваную сістэму дзяржаўнага ўліку меліярацыйных сістэм і асобна размешчаных гідратэхнічных збудаванняў і Аўтаматызаваную кнігу ўліку гісторыі палёў. Гэтыя інфармацыйныя прадукты дапамагаюць эканоміць сродкі і набліжаюць да так званага дакладнага земляробства.

Сёлета, дарэчы, вучоныя папярэджваюць пра залішняе затапленне сельгасугоддзяў, у тым ліку меліяраваных. «Меліярацыя будзе працаваць, але яна не робіць цуды, — заўважыў вучоны. — З-за шчодрых ападкаў вада будзе затрымлівацца на паверхні даўжэй за норму. Там, дзе восенню сельгастэхніка зрабіла глыбокія «тупіковыя» каляіны ў полі, мэтазгодна працягнуць барозны да каналаў, каб скінуць ваду».

## НЕБУЛЬБЯНЫХ ГАДОЎ НЕ БЫВАЕ

Мінулы год стаў для бульбаводства Беларусі знакавым — упершыню ўраджайнасць наблізілася да паказчыка 300 ц/га (калі быць дакладным — 291 ц/га). Гэта больш, чым летась у Польшчы і Прыбалтыцы, а ва Украіне і Расіі такой ураджайнасці ўвогуле не было ніколі, сцвярджаюць вучоныя. У савецкі час максімальная ўраджайнасць бульбы была 208 ц/га.

Умовамі поспеху **намеснік генеральнага дырэктара Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па бульбаводстве і плодаагароднінаводстве Вадзім МАХАНЬКО, кандыдат сельскагаспадарчых навук,** назваў уклад беларускай навукі ў гэту галіну раслінаводства і сістэму кантролю за якасцю насення. Вельмі важным ён таксама лічыць канцэнтрацыю вытворчасці. «Калі ў 2016 годзе бульбай сур'ёзна, як яны самі лічылі, займаліся больш за 400 гаспадарак, то ў 2017-м — 257, — паведаміў вучоны. — Гэта вельмі станоўчая тэндэнцыя, якую мы вітаем. Мы заўсёды казалі, што калі гаспадарка жадае займацца бульбай, то плошча пасадкі павінна быць не менш за 200 га. У сучасных умовах толькі ў гэтым выпадку мы можам забяспечыць прымальны сабекошт».

**Сёлета, дарэчы, вучоныя папярэджваюць пра залішняе затапленне сельгасугоддзяў, у тым ліку меліяраваных. «Там, дзе восенню сельгастэхніка зрабіла глыбокія «тупіковыя» каляіны ў полі, мэтазгодна працягнуць барозны да каналаў, каб скінуць ваду».**

Дзякуючы канцэнтрацыі вытворчасці і больш якаснаму насенню летась сярэдні сабекошт бульбы па Беларусі ўдалося знізіць на 2 капейкі ў параўнанні з 2016 годам — да 10 капеек за кілаграм. «Гэта добры сусветны ўзровень», — лічыць Вадзім Маханько.

Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па бульбаводстве і плодаагароднінаводстве супрацоўнічае з Расійскай Федэрацыяй. За пяць апошніх гадоў пастаўкі бульбы туды павялічыліся больш чым у шэсць разоў. Акрамя таго, два апошнія гады беларускую харчовую бульбу і яе насенне актыўна купляюць Узбекістан, Казахстан, трэці год запар — Грузія.

Вучоныя падкрэсліваюць, што калі ў гаспадарцы працуюць добрыя кіраўнік і аграном, якія правільна падабралі сарты, засадзілі поле якасным насеннем і захоўваюць тэхналогіі, то без бульбы там не застануцца. «Гаспадаркі, з якімі мы працуем, за тры апошнія, вельмі розныя, гады атрымлівалі стабільна высокія ўраджаі па нізкім сабекошце. Небульбяных гадоў не можа быць пры ўмове індустрыяльнага навукова абгрунтаванага бульбаводства», — кажа намеснік дырэктара навуковага інстытута.

У апошнюю зіму і вясну не было рэзкіх перападаў тэмператур у крытычныя перыяды, і зіму расліны перажылі добра, кажуць вучоныя. Гэта датычыцца і костачкавых (сліва, алыча, вішня, чарэшня), і семечкавых (яблыня, груша). Па прагнозе, будучае лета для беларускіх садоў і агародаў будзе звычайным. Не чакаецца ні засухі, ні празмерных ападкаў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
5 КРАСАВІКА 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 7 (15838)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Імёны*

## Макс МІРОНАЎ:

# «Першую сумку пашыў для жонкі»



**Калі б гадоў 15 таму бабруйскаму школьніку Максіму сказалі, што ён стане дызайнерам, не паверыў бы, бо акрамя назвы «Dolce & Gabbana» пра моду больш нічога не чуў. І вучыцца пайшоў у Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, філіял якога якраз знаходзіўся ў родным горадзе. Хацеў працаваць на вытворчасці — пажадана кіраўніком.**
**Сёння Макс Міронаў — вядомы дызайнер. Яго сумкі носяць не толькі беларускія модніцы: у шафах гімнасткі і тэлевядучай Ляйсан Уцяшавай і салісткі гурта «А-студыя» Кэці Тапурыі таксама ёсць аксесуары ад маладога майстра. Мы завіталі да Макса ў майстэрню і распыталі пра яго працоўны дзень, канкурэнцыю сярод дызайнераў і творчыя эксперыменты.**

***— Як вас, эканаміста па адукацыі, занесла ў сферу моды?***

— Калі вучыўся ва ўніверсітэце, вырашыў, што хачу звязаць сваю дзейнасць з тэкстыльнай прамысловасцю. Але не ведаў, як гэта зрабіць. У той час мы з прыяцелямі спрабавалі самавыявіцца. Сярод майго атачэння было шмат тых, хто захапляўся хэнд-мэйдам. Мы перараблялі рэчы. Памятаю, як знайшоў старое паліто і пафарбаваў яго ў каструлі.

Пра сумкі адразу не задумваўся. Хацелася стварыць якую-небудзь марку адзення. Тады «выстраліў» брэнд «Extra», і я ў многім хацеў быць падобным да іх. Рабіў прынты: гэта цяпер іх на прафесійным абсталяванні друкуюць, а раней наносілі малюнкі акрылавымі фарбамі. Мне было 20 гадоў, і гэта ўсё здавалася вельмі цікавым.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

*Без догмаў*

# ДОБРАЯ ЗВЫЧКА СА ШКОЛЫ

## Ці можна ўдыхнуць жывую душу ў партрэты класікаў?

**Лозунг «Найлепшы падарунак — кніга», на жаль, сёння не актуальны. Многія дзеці не любяць чытаць, а літаратура ў іх асацыюецца пераважна са школьнай праграмай. Гэтыя стэрэатыпы даволі распаўсюджаныя ў грамадстве, але ці адпавядаюць яны рэчаіснасці? Няўжо нежаданне чытаць — невылечны дыягназ? У гэтым паспрабавалі разабрацца ўдзельнікі круглага стала з правакацыйнай назвай «Школа супраць літаратуры», які арганізавалі дзіцячыя пісьменнікі Яўгенія ПАСТЭРНАК і Андрэй ЖВАЛЕЎСКІ.**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### СУД НАД ГЕРАСІМАМ

— Дзецям цяжка чытаць класіку. «Рэдкая птушка» даляціць да сярэдзіны аповесці «Тарас Бульба» добраахвотна. Яны сумна машуць крыламі, ім становіцца цяжка, — канстатуе **Марыя БЯРШАРДСКАЯ, дзіцячы пісьменнік і сцэнарыст** (Марыя некалькі апошніх гадоў выкладае літаратуру ў прыватных школах па расійскай праграме, вядзе пятыя і шостыя класы. У беларускай школьнай праграме «Тарас Бульба» цяпер не вывучаецца. — **Аўт.**) — Таму я заўсёды імкнуся звязаць класічныя тэксты з сучаснасцю, з асабістым вопытам маіх вучняў, мы разам шукаем тое, што актуальна для сучаснікаў. Напрыклад, калі мы чыталі «Тараса Бульбу», то разважалі над тым, а што ж такое здрада? Дзе яна пачынаецца? Дзе твой уласны выбар? Якім шляхам ты павінен ісці: сваім ці за ўсімі? Калі Андрый прыносіць у абложаны горад ежу для сваёй каханай, гэта ўжо здрада ці яшчэ не? Дзяцей гэта зачапіла, яны абмяркоўвалі, спрачаліся. З кожнага літаратурнага твора я спрабую выцягнуць тое, што прымушае іх думаць і спрачацца.

Калі мы чыталі з пяцікласнікамі «Муму» Тургенева, то вырашылі арганізаваць суд. Ці вінаваты Герасім? Частка вучняў выступала на баку абароны, іншыя — на баку абвінавачвання. Спачатку ніхто не хацеў быць пані, але я пераканала дзяцей у тым, што любы факт можна трактаваць з розных пунктаў погляду. Па сутнасці, суд — гэта яшчэ і цудоўны спосаб праверыць, ці прачытаў вучань твор, толькі не самым занудным спосабам. Для таго каб перакана̂ўча аргументаваць, трэба добра ведаць тэкст. Нямому Герасіму на судовым працэсе таксама далі апошняе слова (прыдумалі чароўны напой, каб той змог загаварыць). У гэтым пятым класе Герасіма апраўдалі. А ў іншым дзеці моцна абураліся тым, што Тургенеў так сумна завяршыў сваё апавяданне. Таму я прапанавала ім напісаць свой варыянт канцоўкі, і дзяцей гэта захапіла...

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

*Пазнаёміцца з прафесіяй*

# НЕ ТРАПІЦЬ НА ВУДУ КІБЕРЗЛАЧЫНЦАЎ,

## або Калі тэхналогіі — пад аховай

**Упершыню аб высокатэхналагічным злачынстве ў Беларусі загаварылі ў лістападзе 1998 года. Тады зламыснік з дапамогай шкоднай праграмы «дабраўся» да сеткавых рэквізітаў інтэрнэт-карыстальнікаў найбуйнейшага ў краіне правайдара. Сёння навіны пра хакерскія атакі з'яўляюцца ледзьве не кожны дзень, а барацьба з кіберзлачыннасцю перайшла на іншы ўзровень. Карэспандэнт «Чырвонкі. Чырвонай змены» пагутарыла з тымі, хто беражэ нас у век інфармацыйных тэхналогій, і высветліла, як не трапіць на вуду «камп'ютарных геніяў».**

### «Нюансы» лічбавага веку

— Я кожны дзень бачу прыклады небяспекі ў інтэрнэце, таму ведаю, як засцерагчыся і не стаць ахвярай віртуальных махляроў, — кажа **Яўген ДАВІДОВІЧ, капітан міліцыі, старшы оперупаўнаважаны групы па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій крымінальнай міліцыі УУС адміністрацыі Маскоўскага раёна г. Мінска.** — А звычайным, як кажуць, «юзерам» трэба проста рабіць усё ўсвядомлена.


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.
**Спецыялісты раяць больш уважліва ставіцца да сваіх персанальных даных.**

Усвядомлена — гэта значыць не адкрываць падазроныя лісты, якія прыходзяць на электронную пошту, не «весціся» на прынізлівыя просьбы аб дапамозе віртуальных знаёмых у сацыяльных сетках, не перадаваць персанальныя даныя трэцім асобам.

— Не разумею, чаго часам у людзях больш: даверлівасці або глупства? Але «раскідвацца» рэквізітамі банкаўскіх картак — гэта занадта. Ведаючы 16 лічбаў з аднаго боку карткі і 3 — з другога, махляр з лёгкасцю завалодае ўсімі вашымі фінансамі, — тлумачыць Яўген Давідовіч.

Аператыўнік расказвае, што сёння шмат выпадкаў, калі дзеці без дазволу распараджаюцца грашамі з картак бацькоў.

— Мамы і таты нават чуць пра такія «забавы» свайго дзіцяці не хочуць. Як вынік — банк вяртае ўсё да капейкі, людзі задаволеныя ідуць дадому і нават забываюць пра непрыемны выпадак. Але памятаю банк, па заяве якога пачынаецца расследаванне наконт знікнення фінансаў. Высвятляецца, што «самы мілы на свеце сын» аплачваў бацькоўскай карткай гульнявыя сайты. Таму калі вас просяць пагаварыць са сваімі роднымі і праверыць хатнія камп'ютары — трэба гэта зрабіць, — раіць оперупаўнаважаны. — Крымінальная адказнасць тут наступае з 14 гадоў. За такія «жарты» смельчакоў чакае штраф або пазбаўленне волі. Вам гэта трэба?

*(Заканчэнне на 7-й стар. «ЧЗ».)*

2 ІНФАРМБЮРО

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

5 04 2018 г.

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «АКТИВНОЕ ЛЕТО С «ДАРИДОЙ»

**1. Организатор рекламной игры**.

Общество с ограниченной ответственностью «Смарт Нова», далее именуемое «Организатор», расположенное по адресу: 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67-139, офис 901, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191720959, свидетельство о государственной регистрации выдано 04.03.2013 г.

**2. Наименование рекламной игры** – «Активное лето с «Даридой».

**3. Территория проведения.**

Рекламная игра «Активное лето с «Даридой» проводится на территории Республики Беларусь.

**4. Срок начала рекламной игры** – 12 апреля 2018 года, **срок окончания** – 20 июля 2018 года.

**5. Состав комиссии по проведению рекламной игры:**

• Гарбузов Сергей Николаевич, первый заместитель генерального директора по маркетингу и логистике ЧП «Дарида», председатель комиссии;

• Старовойт Антон Петрович, специалист по рекламе ЧП «Дарида», член комиссии;

• Кулешов Александр Викторович, начальник управления маркетинговой политики ЧП «Дарида», член комиссии;

• Шамаль Дмитрий Эдуардович – директор ООО «Смарт Идея», член комиссии;

• Мазура Сергей Михайлович – специалист отдела медиапланирования ООО «Смарт Нова», член комиссии.

**6. Цель Игры.**

Рекламная игра «Активное лето с «Даридой» проводится с целью стимулирования продаж продукции под торговой маркой «Дарида», а именно:

– Вода минеральная питьевая лечебно-столовая «Дарида» газированная. Объемы: 0,5 л, 0,75 л, 1 л, 1,5 л.

– Вода минеральная питьевая лечебно-столовая «Дарида» негазированная. Объем: 1,5 л.

– Напиток безалкогольный негазированный «Аква фруктовая» «С ароматом арбуза» пастеризованный. Объем: 0,75 л, 1,5 л.

– Напиток безалкогольный негазированный «Аква фруктовая» «С ароматом манго» пастеризованный. Объем: 0,75 л, 1,5 л.

– Напиток безалкогольный негазированный «Аква фруктовая» «С ароматом клубники и лимона» пастеризованный. Объем: 0,5 л.

– Напиток безалкогольный негазированный «Аква фруктовая» «С ароматом яблока» пастеризованный. Объем: 0,5 л.

– Напиток безалкогольный негазированный «Аква фруктовая» «С ароматом красного винограда и алоэ вера» пастеризованный. Объем: 0,75 л, 1,5 л.

– Напиток безалкогольный негазированный «Аква фруктовая» «С ароматом клюквы» пастеризованный. Объем: 0,75 л, 1,5 л.

– Напиток безалкогольный негазированный «Аква фруктовая» «С ароматом лимона и охлаждающим эффектом» пастеризованный. Объем: 0,75 л, 1,5 л.

– Напиток безалкогольный негазированный «Аква фруктовая» «С ароматом персика» пастеризованный. Объем: 0,75 л, 1,5 л.

**7. Условия участия и порядок отбора участников Рекламной игры.**

7.1. К участию в рекламной игре допускаются только граждане Республики Беларусь.

7.2. Для участия в рекламной игре необходимо в срок с 12 апреля 2018 года до 13 июня 2018 года выполнить следующие условия:

7.2.1. Приобрести 5 любых бутылок воды «Дарида» из списка согласно пункту 7 настоящих Правил.

7.2.2. Отправить 5 этикеток от пяти приобретенных бутылок воды «Дарида» из списка согласно пункту 7 настоящих Правил почтовым отправлением (письмом) по адресу: **220035, г. Минск, а/я 62.**

Для этого нужно вложить этикетки бутылок воды «Дарида» в количестве 5 (пяти) штук в почтовый конверт; на почтовом конверте разборчиво печатными буквами написать следующие данные: 1) фамилия, имя, отчество (полностью, без сокращений); 2) точный почтовый адрес: почтовый индекс (обязательно), область (желательно), район (желательно), населенный пункт (обязательно), улица (обязательно), дом (обязательно), корпус (при наличии обязательно), квартира (при наличии обязательно); 3) номер мобильного телефона в международном формате и название оператора (номер телефона и название оператора можно вложить внутрь конверта).

7.2.3. Письмо, соответствующее указанным условиям, участвует в розыгрыше призов. Участник может отправлять неограниченное количество писем.

7.2.4. К участию в рекламной игре не принимаются:

– письма, полученные Организатором до 12 апреля 2018 года или после 13 июня 2018 года (дата получения определяется по почтовому штемпелю получения);

– письма, отправленные по почте не с территории Республики Беларусь (пункты отправления определяются по почтовому штемпелю отправления на конверте);

– письма, в которых указано два и более участника рекламной игры;

– письма, заполненные неразборчиво либо не в соответствии с настоящими Правилами;

– письма, содержащие менее 5 (пяти) этикеток бутылок воды «Дарида».

7.3. Участником рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, близкие родственники и лица, находящиеся с ними в отношениях свойства, а также члены Комиссии.

**8. Состав и размер призового фонда.**

8.1. Призовой фонд Игры сформирован за счет имущества и денежных средств заинтересованного лица – частного предприятия «Дарида».

8.2. Размер Призового фонда составляет 36 849,40 (Тридцать шесть тысяч восемьсот сорок девять белорусских рублей 40 копеек).

| № | Наименование | Категория приза | Название приза далее в Правилах | Кол-во, шт. | Цена за 1 шт., бел. руб. с НДС | Общая стоимость, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Велосипед Stream Elastic 26, горный, для взрослых, Китай | I категория | Велосипед Stream Elastic | 50 | 250,02 | 12 501,00 |
| | Денежные средства | | | | 38,00 | 1 900,00 |
| 2 | Самокат 2-колесный Ultimate, 200 мм | I категория | Самокат Ultimate | 40 | 99,984 | 3 999,36 |
| 3 | Самокат 2-колесный Fabolous, 200 мм | I категория | Самокат Fabolous | 60 | 99,984 | 5 999,04 |
| 4 | Рюкзак 600D с логотипом 1+0 | II категория | Рюкзак 600 D | 200 | 24,75 | 4 950,00 |
| 5 | Волейбольный мяч, дизайн «Смарт Нова» | II категория | Волейбольный мяч | 500 | 15,00 | 7 500,00 |
| **Итого:** | | | | | | 36 849,40 |

**9. Место, дата, время и порядок розыгрыша призового фонда, порядок определения выигравших участников рекламной игры.**

Розыгрыши призов будут осуществляться в два этапа. Розыгрыши призов проводятся открыто в присутствии комиссии в офисе ООО «Смарт Нова» по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, д. 67, офис 901.

**Розыгрыш 1:**

В розыгрыше 1 **16.05.2018 года в 15 часов** принимают участия письма, полученные Организатором с 12.04.2018 года по 13.05.2018 года (по почтовому штемпелю получения). Разыгрываются призы в следующей последовательности: велосипед Stream Elastic – 25 шт., самокат Ultimate – 20 шт., самокат Fabolous – 30 шт., рюкзак 600D – 100 шт., волейбольный мяч – 250 шт.

**Розыгрыш 2:**

В розыгрыше 2 **15.06.2018 года в 15 часов** принимают участия письма, полученные Организатором с 12.05.2018 года по 13.06.2018 года (по почтовому штемпелю получения). Разыгрываются призы в следующей последовательности: велосипед Stream Elastic – 25 шт., самокат Ultimate – 20 шт., самокат Fabolous – 30 шт., рюкзак 600D – 100 шт., волейбольный мяч – 250 шт.

Для проведения каждого розыгрыша письма участников загружаются в специальный прозрачный барабан. Член комиссии производит случайное извлечение письма из барабана. После извлечения письмо вскрывается и проверяется на предмет выполнения условий рекламной игры. Если условия рекламной игры выполнены, участник, чье письмо было извлечено из барабана, становится победителем рекламной игры. В случае если письмо не соответствует правилам рекламной игры, то процедура выбора победителя проводится заново до того момента пока не будет вытянуто письмо, полностью соответствующее условиям рекламной игры.

**10. Место, порядок и сроки выдачи призов и уведомления победителей.**

Список победителей рекламной игры по результатам двух розыгрышей будет опубликован на сайте: **www.darida.by/igra**

Победители, выигравшие призы I категории (велосипеды и самокаты), уведомляются о своем выигрыше в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения розыгрыша письмом, высланным по адресу, указанному участником на почтовом конверте. Для получения приза победители должны явиться в офис Организатора игры по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 901 в любой рабочий день **до 20 июля 2018 года** включительно, а также по субботам 02.06.2018 г. или 30.06.2018 г. по предварительному согласованию даты и времени прибытия с представителем Организатора по телефонам: +375 (17) 360-11-20 или +375 (17) 360-11-30 для заполнения документов на получение приза. В случае если победитель совершеннолетний — при личной явке с паспортом (видом на жительство на территории Республики Беларусь); в случае если победитель несовершеннолетний — при личной явке в сопровождении законного представителя со свидетельством о рождении победителя рекламной игры и паспортом (видом на жительства на территории Республики Беларусь) законного представителя. После прохождения процедуры заполнения документов победитель должен получить сам приз (велосипед или самокат) на складе, расположенном по адресу: Минский район, агрогородок Ждановичи, ул. Линейная, 1а.

Призы II категории (рюкзаки и волейбольные мячи) высылаются победителям по почте на адрес, указанный на почтовом конверте, признанном выигрышным, не позднее 10.07.2018 года.

В случае отказа победителя от получения приза, неполучения приза в установленном правилами порядке и сроки либо невыполнения других обязательных условий его получения приз остается у Организатора.

**11. Порядок информирования об условиях и результатах Игры.**

Правила рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала рекламной игры. Результаты розыгрыша призов будут опубликованы в газете «Звязда» не позднее **25 июня 2018 года**.

**12. Другие условия.**

12.1 Налогообложение приза производится в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь. Участник самостоятельно несет ответственность за соблюдение им действующего законодательства в сфере налогообложения.

12.2 Участник рекламной игры, претендующий на получение приза, обязуется заполнить и подписать все необходимые документы, предоставляемые Организатором рекламной игры для получения приза.

12.3 Организатор не вступает в споры между участниками относительно определения собственника выигранного приза и/или претендентов на получение приза. Участник вправе распорядиться полученным призом по своему усмотрению.

12.4 Организатор не несет ответственности за качество работы почтовых служб, в частности за недоставку либо несвоевременную доставку почтовой корреспонденции.

12.5 Организатор рекламной игры не несет ответственности за любые риски, связанные с повреждением Призов и их эксплуатацией, возникшие после передачи Призов Победителям.

12.6 Участие в рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие участников с настоящими Правилами, принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования. Несоблюдение участником требований настоящих Правил считается его отказом от участия в Игре.

12.7 Факт участия в рекламной игре означает, что ее участники согласны с тем, что их имена, фамилии, отчества, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Частным Предприятием «Дарида» в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель, выигравший приз, дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной рекламной игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Частному Предприятию «Дарида».

12.8. Организатор не оплачивает победителю расходы, связанные с проездом к месту получения приза.

12.9. Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с участником в случае недостоверной информации, представленной Участником.

12.10. Все возможные претензии участников в отношении организации и условий передачи призов должны быть адресованы непосредственно Организатору рекламной игры по адресу: 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67-139, офис 901.

12.11 Телефон информационной линии 8 (017) 360-11-20. Время работы информационной линии: с 12.00 до 17.00 в рабочие дни.

Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3242 от 03.04.2018 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь

**Общество с ограниченной ответственностью «Страховой брокер «ЮНИБРОКЕР»**

УНП 806000735

г. Минск, пр-т Независимости, 172, пом. 300

интернет-сайт: unibroker.by

**Бухгалтерский баланс на 1 января 2018 г.**

| Актив | Сумма | Пассив | Сумма |
|---|---|---|---|
| Основные средства | | Уставный капитал | 59 |
| Нематериальные активы | 1 | Неоплаченная часть уставного капитала | |
| Доходные вложения в материальные активы | | Собственные акции (доли в уставном капитале) | |
| Вложения в долгосрочные активы | | Резервный капитал | |
| Долгосрочные финансовые вложения | | Добавочный капитал | 1 |
| Отложенные налоговые активы | | Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | -1 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | | Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | |
| Прочие долгосрочные активы | | Доходы будущих периодов | |
| Запасы | | Резервы предстоящих платежей | |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | | Прочие долгосрочные обязательства | |
| Расходы будущих периодов | | Краткосрочные кредиты и займы | |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | | Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | | Краткосрочная кредиторская задолженность | 3 |
| Краткосрочные финансовые вложения | | в том числе: прочим кредиторам | 3 |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 61 | | |
| Прочие краткосрочные активы | | Прочие краткосрочные обязательства | |
| **БАЛАНС** | **62** | **БАЛАНС** | **62** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2017 года**

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2017 |
|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 1 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | -1 |
| Валовая прибыль | 030 | |
| Управленческие расходы | 040 | |
| Расходы на реализацию | 050 | |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | -1 |
| в том числе: | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | -1 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | -1 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | -1 |
| Налог на прибыль | 160 | |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | -1 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | 1 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | |

Аудиторское заключение выдано 16.03.2018 аудитором – ИП Верезубова Татьяна Анатольевна.

Место жительства: 220019, г. Минск, ул. Сухаревская, 39-6.

Свидетельство о государственной регистрации № 100479384 от 25.02.2000 г.

По мнению аудитора, прилагаемая годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ООО «Страховой брокер «ЮНИБРОКЕР» по состоянию на 31 декабря 2017 г., финансовые результаты деятельности за период с 25.09.2017 по 31.12.2017 г., в соответствии с законодательством Республики Беларусь

| **Извещение о проведении повторного аукциона** | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Ф-л «Несвижское управление магистральных газопроводов ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», Минская обл., г. Несвиж |
| **Предмет аукциона** | |
| **Демонтированное оборудование АГЗС, расположенное по адресу: Минская обл., г. Несвиж, ул. Сновская, 7** | |
| **Лот № 1** | |
| Емкость для хранения сжиженного углеводородного газа | |
| Емкость для хранения сжиженного углеводородного газа | |
| Насосный агрегат Hydro-Vacuum SKC | |
| Раздаточная колонка сжиженного газа Petrolmeccanica LPG 6000P | |
| Комплект трубопроводов с запорной и предохранительной аппаратурой | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **8 192,15 белорусского рубля (снижена на 45 %)** |
| **Лот № 2** | |
| Емкость для хранения сжиженного углеводородного газа | |
| Емкость для хранения сжиженного углеводородного газа | |
| Насосный агрегат Hydro-Vacuum SKC | |
| Раздаточная колонка сжиженного газа Petrolmeccanica LPG 6000P | |
| Комплект трубопроводов с запорной и предохранительной аппаратурой | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **8 192,15 белорусского рубля (снижена на 45 %)** |
| **Лот № 3** | |
| Емкость для хранения сжиженного углеводородного газа | |
| Емкость для хранения сжиженного углеводородного газа | |
| Насосный агрегат Hydro-Vacuum SKC | |
| Раздаточная колонка сжиженного газа DPC050 LE1D | |
| Комплект трубопроводов с запорной и предохранительной аппаратурой | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **8 243,75 белорусского рубля (снижена на 45 %)** |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 19.12.2017 | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **19.04.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **13.04.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

# ДОБРАЯ ЗВЫЧКА СА ШКОЛЫ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Калі ў чацвёртым класе мы чыталі апавяданне Віктара Драгунскага «Што я люблю... І чаго не люблю», я прапанавала дзецям напісаць аналагічны тэкст пра сябе. Ён чапляе, таму што там няма агульных фраз накшталт «Я люблю салодкае» ці «Я не люблю рабіць урокі». Там шмат асабістага, што дазваляе скласці ўяўленне пра незнаёмага чалавека. Паабяцала, што таксама пра сябе напішу. Гэта быў яшчэ і цудоўны спосаб нам пазнаёміцца. Практычна ўсе дзеці прынеслі не проста сачыненне на паперы, а самаробныя кніжкі з карцінкамі. Іх шчырасць мяне кранула. Яны пісалі: «я люблю рваныя джынсы», «...люблю крышыць грыбы, яны прыемныя навобмацак», «...люблю вялікія дамы», «я не люблю, калі мяне дражняць», «не люблю, калі мяне называюць малечай і калі дарослыя людзі бяруць на рукі, я тады саромеюся», «я не люблю, калі матуля пілачкай точыць пазногці», «не люблю брокалі, фу...», «я не люблю, калі мая сястрычка плача, а раве яна кожны дзень!» Такая ступень шчырасці і адкрытасці вельмі важная пры знаёмстве з літаратурай.

**«Галоўная задача настаўніка — не навучыць, а «запаліць» інтарэс, каб далей чалавек рухаўся сам. Калі ён робіць гэта свядома, то вынік зусім іншы, чым калі яго прымушаюць».**

Марыя Бяршардская ўпэўнена, што нельга дапускаць, каб пісьменнікі ўспрымаліся дзецьмі проста як «галовы на партрэтах». Асабліва калі тыя нарадзіліся ў сярэдзіне XIX стагоддзя — для вучняў гэта нешта па-за межамі іх разумення, быццам бы тыя — людзі з паралельнага свету. «А я ім спрабую паказаць, што гэта былі жывыя людзі, са сваімі характарамі, можа быць, крыху дзівакаватыя, яны былі знаёмыя паміж сабой, хадзілі разам на паляванне, сварыліся, — расказвае пісьменніца. — Усіх радуе, напрыклад, аповед пра тое, што Някрасаў вельмі любіў сваіх сабак, і калі пасяджэнні «Сучасніка» праходзілі ў яго дома, любімы гадаванец пастаянна згрызаў абутак гасцей, але гаспадар ніколі яго за гэта не караў. Пісьменнік быў гатовы кампенсаваць гасцям страты, але сабаку не зачыняў. Такія камічныя гісторыі запамінаюцца надоўга. А яшчэ важна казаць пра літаратуру ў кантэксце гісторыі — каб дзеці разумелі, што і чаму пісалася менавіта ў той час».

Марыя Бяршардская звяртае ўвагу на тое, што ў школьнай праграме вельмі шмат сумных вершаў аб прыродзе — атрымліваецца нейкая бясконцая «Песня аратага», што не чапляе сучасных дзяцей. Паэзія павінна быць рознай. Напрыклад, японскія вершы — гэта таксама паэзія, толькі без рыфмаў.

## ПУШКІН ПАД ДУБАМ

— А мае дзеці вельмі любяць чытаць, і ў нас ёсць пэўныя традыцыі, — прызнаецца **настаўніца рускай мовы і літаратуры маскоўскай школы № 734 імя Аляксандра Тубельскага, таксама дзіцячы пісьменнік Кацярына ЦІМАШПОЛЬСКАЯ.** — Напрыклад, восенню і вясной мы ідзём да дуба і чытаем там вершы Пушкіна на памяць. Гэта робяць і вучні, і бацькі, якія таксама захоплены працэсам. Калі мы чытаем вершы ўслых, у нас дзейнічае арыгінальны вымяральнік — мурашкаметр. З'явіліся ў слухачоў мурашкі, значыць, усё супер! А калі мурашкі не з'явіліся, яшчэ ёсць над чым працаваць, але дзеці проста геніяльна чытаюць.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Трэба зазначыць, што школа імя Тубельскага — інавацыйная ўстанова, размешчаная ў спальным раёне Масквы. Яна не можа пахваліцца багатым тэхнічным аснашчэннем, тут не практыкуюць конкурсны адбор, але ёй вельмі пашанцавала на педагогаў. Навучальную ўстанову называюць «Школай самавызначэння». У аснову навучальнага і выхаваўчага працэсу тут пакладзена свабода ад догмаў, супрацоўніцтва настаўніка і вучня, свабода асобы дзіцяці, таму вельмі многія імкнуцца сюды трапіць.

**«Калі мы хочам данесці інфармацыю пра кнігі да мэтавай аўдыторыі, то лепш за ўсё гэта рабіць у інтэрнэце. Або трэба запускаць у класы шпіёнаў, якія будуць праходзіць па графе «Сябры».**

— Міністэрства адукацыі нам рэкамендуе, а не забараняе, а ўсё, што не забаронена, — дазволена, — жартуе педагог. — Ёсць спіс пісьменнікаў і паэтаў, а якія іх браць для вывучэння, я выбіраю самастойна. Калі ў праграме напісана «Паэты сярэбранага веку», гэта ж сапраўднае раздолле! Ці, напрыклад, «Вершы Сяргея Ясеніна». Ясенін — геніяльны паэт, і верш «Бяроза», вядомы нам усім яшчэ з дзіцячага садка, — не адзіны яго твор, варты ўвагі. У яго ёсць і «Споведзь хулігана», і «Песня пра сабаку». Ён быў звычайны чалавек, са сваімі недахопамі, сумняваўся, шукаў... І гэта трэба прыняць. Нядаўна мы адзначалі з вучнямі дзень нараджэння Уладзіміра Высоцкага: чыталі яго вершы, спявалі песні. Хачу падкрэсліць, што наша школа — за літаратуру! У нас дзейнічае і гурток «Мастацкае слова», і паэтычны тэатр. Калі межы паміж школай і жыццём размываюцца, гэта дзяцей захапляе. Дзеці бягуць у школу, таму што ім тут цікава.

Я лічу, што галоўная задача настаўніка — не навучыць, а «запаліць» інтарэс, каб далей чалавек рухаўся сам. Калі ён робіць гэта свядома, то вынік зусім іншы, чым калі яго прымушаюць. Прычым запускаецца ланцуговая рэакцыя: калі «запаліць» аднаго, той «запаліць» другога, другі — трэцяга і гэтак далей. Захапіць усіх немагчыма, але павесці за сабой большасць — у нашых сілах. А калі збіраецца вялікая каманда — запальваецца факел.

У Кацярыны Цімашпольскай пацікавіліся, ці знаходзіцца на школьных уроках месца для сучаснай літаратуры?

— Не перажывайце, мы чытаем і Андрэя Жвалеўскага, і Яўгенію Пастэрнак, і Марыю Бяршардскую. Я імкнуся выкарыстаць кожны кавалачак часу і на ўроку, і па-за заняткамі, каб штосьці пачытаць і абмеркаваць, — адказала Кацярына. — Вучні і самі прыносяць кнігі, расказваюць, што чыталі, раяць адно аднаму. У нас арганізаваны буккросінг у класе. Без сучаснай літаратуры ніяк нельга абысціся, таму што цяперашнім дзецям ужо не вельмі цікавая літаратурная класіка, ці не ўся яна. Калі ў мяне на ўроку дрэнна «заходзіць» Гогаль, то мы лепш пакінем яго ў спакоі. Тэксты гэтага класіка насамрэч складаныя для пяцікласнікаў, якіх куды больш цікавяць загадкі, звязаныя з яго смерцю, і некаторыя факты з біяграфіі. Я біру адказнасць на сябе, ці пачаць з вучнямі чытаць штосьці іншае — гэта мой асабісты выбар.

## «Я ПРАЧЫТАЎ... ЗАБАЎНА!»

— На ўроках літаратуры ў нас вельмі мала самой літаратуры, — канстатуе **дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі, выкладчыца Інстытута журналістыкі БДУ Людміла КАМЛЮК-ЯРАШЭНКА.** — Немагчыма зводзіць літаратуру да фактаў і адштурхоўвацца ад пытання: а што хацеў сказаць нам аўтар? Шлях да мастацкага твора трэба выбудоўваць ад чытача, і галоўная мэта — не вывучыць твор, а «распакаваць» чытача, падрыхтаваць яго, а ўжо потым арганізаваць дыялог «чытач—пісьменнік».

Людміла вырашыла пайсці шляхам «малых спраў» — стала арганізоўваць трэнінгі, семінары, прэзентацыі, выступленні, сустрэчы з пісьменнікамі, каб акуратна «прышчапіць» педагогам простую думку — **не трэба «вывучаць» літаратуру, яе трэба чытаць.** Спачатку некаторыя педагогі ўспрымалі ідэю насцярожана, але за пяць гадоў сфарміравалася каманда аднадумцаў. Яны жадаюць не проста вывучаць літаратуру як аб'ект, а імкнуцца выклікаць чытача на размову.

У 2016 годзе ўдалося запусціць рэспубліканскі інавацыйны праект «Укараненне мадэлі фарміравання чытацкай кампетэнтнасці вучняў у працэсе сеткавага ўзаемадзеяння». Нягледзячы на складаную фармулёўку, праект абсалютна жывы. Яго мэта — развіць культуру чытання і мадэрнізаваць гэты працэс, зрабіць яго сучасным. Па форме гэта розныя анлайн-сэрвісы, гульні, вэб-квэсты, інтэрактыўныя сайты — тое, што стымулюе цікавасць у дзяцей і падлеткаў, якія жывуць у сецыве. У праекце ўдзельнічае 31 установа адукацыі.

**У школьнай праграме вельмі шмат сумных вершаў аб прыродзе — атрымліваецца нейкая бясконцая «Песня аратага»**

Першае пытанне, якое задаюць настаўнікі школьнікам пасля чытання тэксту: «А як вам было чытаць — камфортна або дыскамфортна?» Калі дыскамфортна, прыходзіцца намацваць праблемныя месцы, разбірацца з імі. Калі дзіця пасля чытання кажа: «Я прачытаў, мне ўсё было незразумела — ні пра што гэты твор, ні што хацеў сказаць яго аўтар, але твор мне спадабаўся. Забаўна. Я чытаю і чую, як быццам на металічны паднос кінулі пацерку», — такая рэакцыя цалкам задавальняе педагогаў. Гэта значыць, што першы этап, этап псіхалагічнай гатоўнасці чытача, ужо пройдзены.

Пасля настаўнік сумесна з вучнямі абмяркоўвае, як яны будуць уваходзіць у гэты тэкст, як па ім перасоўвацца. На аснове такой методыкі спецыялісты інстытута развіцця адукацыі распрацавалі адукацыйны вэб-праект «Чытанне ў WEB 2.0. Раман з тэкстам». У гэтым праекце дзеці не толькі пішуць анлайн, але і каментуюць адно аднаго, вучацца аналізаваць творы, чуць іншага.

Вельмі важна, што дзеці аналізуюць тэкст не як аб'ект на анатамічным стале, а як жывы арганізм, які сам накіроўвае чытача, у сваю чаргу настаўнікі прапануюць сучасныя, адэкватныя часу заданні.

**«Калі мы чытаем вершы ўслых, у нас дзейнічае арыгінальны вымяральнік — мурашкаметр. З'явіліся ў слухачоў мурашкі, значыць, усё супер!»**

Напрыклад, зрабіць запіс у сацсеткі — як бы выглядаў «пост», калі б чытач хацеў сабраць пабольш лайкаў. Або справакаваць на чат, на актыўнае абмеркаванне.

І, нарэшце, школьнікі ствараюць буктрэйлеры. «Мы і не чакалі, што гэты занятак так захопіць падлеткаў, — прызнаецца Людміла. — Яны манціруюць іх нават не ў групах, а індывідуальна. Для іх гэта задавальненне».

## У СЕЦІВА ЦІ Ў БІБЛІЯТЭКУ?

**Пісьменніца Яўгенія ПАСТЭРНАК** зрабіла зрэз падлеткавага чытання ў адной асобна ўзятай мінскай гімназіі. Установа гэта тэхналагічная, таму дзяцей адбіралі туды не па прынцыпе «тыя, хто шмат чытае». «Дзе вы бераце інфармацыю пра кнігі?» — запыталася яна ў гімназістаў. І адразу выявілася некалькі асноўных заканамернасцяў. Роля інтэрнэту расце, а бацькоў — зніжаецца. Роля бібліятэкі таксама падае. Прычым да 9 класа яна падае ўжо да нуля.

— То-бок, калі мы хочам данесці інфармацыю пра кнігі да мэтавай аўдыторыі, то лепш за ўсё гэта рабіць у інтэрнэце. Або трэба запускаць у класы шпіёнаў, якія будуць праходзіць па графе «Сябры», — жартуе Яўгенія. — Тры гады запар я прашу падлеткаў назваць некалькі кніг, якія яны нядаўна прачыталі і якія не ўваходзяць у школьную праграму. Яшчэ падчас першага зрэзу стала зразумела, што не існуе агульнага спіса для чытання — усе выбіраюць рознае, і кожнае дзіця ўносіць у спіс свае назвы. Калі гімназісты былі ў шостым класе, яны назвалі 130 найменняў, у сёмым — 125, у восьмым — 129. Гэта значыць, што менш чытаць яны не сталі.

Але да 8 класа спіс яшчэ больш індывідуалізаваўся, стала яшчэ менш паўтораў. Калі ў 6 класе «Гары Потэра» згадалі 20 чалавек, то самая папулярная кніга ў 8-м — «Дзяўчына анлайн» Зоі Саг — паўтарылася толькі сем разоў. І стала значна менш кніг, якія назвалі хоць бы тры-чатыры разы. Заўсёды апрацаваць спіс кніг, напісаны дзецьмі, — гэта для мяне пара гадзін шчыльнай працы з «Гуглам». Асабліва з раздзелам «Коміксы і мангі», які да 8 класа яшчэ больш пашырыўся.

Асабіста мяне вельмі хвалюе, што наша літаратура моцна прайграе перакладной, хоць падлеткі і прызнаюцца, што яны не глядзяць на прозвішча аўтара і часта ўяўлення не маюць, што чытаюць: арыгінал або пераклад? А рускую класіку для задавальнення яны ўвогуле не выбіраюць. І, мяркуючы па крыніцах, з якіх гімназісты чэрпаюць інфармацыю пра кнігі, мы моцна прайграём у раскрутцы нашай літаратуры ў інтэрнэце.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

З нагоды

## «ЗНАМЁНКА» — ВЕЧНА МАЛАДАЯ

**10 красавіка газета «Знамя юности» святкуе свой 80-гадовы юбілей. Толькі ўявіце сабе, што першы нумар пад назвай «Сталінская моладзь» пабачыў свет яшчэ ў 1938 годзе! Уласна «Знаменем юности» выданне стала называцца ў 1956 годзе.**

А сёння гэта — 24-палосны штотыднёвік, які выходзіць па чацвяргах тыражом каля 40 тысяч экзэмпляраў. Газета, як і раней, піша пра моладзь, адукацыю, працаўладкаванне, прафарыентацыю.

«Знамя юности» актыўна падтрымлівае маладых аўтараў. Пры выданні працуе клуб журналістаў-пачаткоўцаў «Равеснік», дзе школьнікі спасцігаюць азы прафесіі на майстар-класах карэспандэнтаў газеты. Многія выпускнікі клуба становяцца студэнтамі Інстытута журналістыкі БДУ.

«Чырвонка. Чырвоная змена» на правах старэйшай маладзёжкі краіны шчыра віншуе калег з іх юбілеем і зычыць новых творчых поспехаў і такога ж запалу, як і дагэтуль!

Запрашальнік

## Не прапусціце «Велікодны куліч»

**Маладзёжны фестываль-выстава «Велікодны куліч», які праводзіцца штогод па ініцыятыве Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі і ўжо стаў добрай традыцыяй, сёлета будзе доўжыцца ва ўсіх рэгіёнах Гродзеншчыны да 15 красавіка.**

Фестывалі-выставы — гэта магчымасць паглядзець на найлепшыя велікодныя кампазіцыі, выкананыя ў розных тэхніках, творчыя работы розных жанраў дзяцей і моладзі, прысвечаныя святу, пакаштаваць смачныя кулічы. Напрыклад, у Лідскім раёне будзе арганізаваны флэшмоб «Бабуліны рэцэпты», дзе кожны ахвотны зможа абмяняцца сямейнымі рэцэптамі па іх выпечцы.

Падчас выстаў у Зэльвенскім, Гродзенскім, Іўеўскім, Астравецкім раёнах усе ўдзельнікі змогуць на некалькі хвілін стаць сапраўднымі мастакамі-творцамі. На майстар-класах не толькі падкажуць, але і пакажуць, як правільна размаляваць яйка, зрабіць сімвалічныя сувеніры з каляровай паперы і саломы, правядуць майстар-класы па разьбе і выпальванні па дрэве.

Валанцёрскія атрады маладзёжнага руху БРСМ "Добрае Сэрца" Навагрудчыны, Шчучыншчыны і Гродна перададуць у сацыяльна-педагагічныя цэнтры і бальніцы велікодныя кулічы, каб разам з тымі, хто мае патрэбу ў падтрымцы, падзяліць радасць Вялікадня.

Адкрытыя дыялогі на тэму «Светлае свята Вялікадня», «Рэлігія ў разуменні сучаснай моладзі», «Царква і моладзь» стануць адным з цэнтральных мерапрыемстваў фестываляў у Бераставіцкім, Воранаўскім і Ваўкавыскім раёнах.

Адзначым таксама, што фестываль носіць конкурсны характар. Будуць названы імёны пераможцаў раённых і гарадскіх выстаў, чые работы ўпрыгожаць выставачную экспазіцыю Гродзенскай вобласці ў рамках рэспубліканскіх мерапрыемстваў у Мінску.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Конкурсы

## БІЯЭТЫКА. ШТО МЫ ПРА ЯЕ ВЕДАЕМ

**У краіне стартаваў Рэспубліканскі конкурс студэнцкіх работ «Даступная біяэтыка». Яго арганізатарамі выступаюць Міністэрства аховы здароўя, Рэспубліканскі камітэт па біяэтыцы сумесна з аддзелам па біяэтыцы Савета Еўропы пры падтрымцы Інфармацыйнага пункта Савета Еўропы ў Мінску.**

Як вынікае ўжо з самой назвы конкурсу, асноўная яго мэта — павышэнне ўзроўню і якасці ведаў у сферы біямедыцыны, фарміраванне ў студэнцкай моладзі актуальных біяэтычных кампетэнцый, стварэнне ўмоў для стымулявання цікавасці да біяэтыкі з боку грамадства.

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца студэнты і магістранты ўстаноў вышэйшай адукацыі, якіх цікавіць, як біямедыцынскія даследаванні адбіваюцца на правах і свабодах асобы, пытанні біяэтыкі, напрыклад, у развіцці рэпрадуктыўных тэхналогій, трансплантацыі органаў і тканак, генетыкі, нейранавукі. Удзел у конкурсе магчымы як індывідуальны, так і ў складзе аўтарскага калектыву (але не больш за тры чалавекі).

У конкурсе прадугледжаны тры намінацыі. У першай з іх — «Эсэ» — могуць быць прадстаўлены пісьмовыя творчыя работы толькі індывідуальнага аўтарства. Удзельнікам прапануецца вызначыць праблему, цалкам раскрыць тэму і біяэтычную праблематыку, прывесці пераканаўчыя аргументы, зрабіць абгрунтаваныя высновы. Журы конкурсу сярод іншага будзе звяртаць увагу на агульную логіку работы, яе афармленне і пісьменнасць.

У намінацыі «Відэаматэрыял» (відэаролік) падаюцца агучаныя відэаматэрыялы працягласцю да 5 хвілін, якія асвятляюць актуальныя для Беларусі пытанні біяэтыкі ў сферы правоў чалавека і біямедыцыны. Журы ацэніць лаканічнасць, інфарматыўнасць сюжэта, яго арыгінальнасць, якасць здымак і мантажу, а таксама гук (тэкст за кадрам і/ці музычнае суправаджэнне).

У намінацыі «Плакат» дазваляецца падаваць плакаты, выкананыя ў рознай тэхніцы. Будуць ацэньвацца раскрыццё тэмы, якасць выканання, мастацкая каштоўнасць работы і арыгінальнасць тэхнікі выканання.

Больш падрабязную інфармацыю можна знайсці на сайце Савета Еўропы www/coe.int/bioethics і Інфармацыйнага пункта Савета Еўропы ў Мінску www.coe.bcu.by.

Конкурсныя работы прымаюцца да 1 ліпеня ўключна. Урачыстае ўзнагароджванне прызёраў і пераможцаў адбудзецца ў Мінску ў кастрычніку бягучага года. Пераможцы будуць запрошаны наведаць аддзел па біяэтыцы Савета Еўропы ў Страсбургу.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Рука дапамогі

## ПРАЦАЎЛАДКАВАЦЦА... МАБІЛЬНА

**Пры Мінскім гарадскім камітэце БРСМ створаны аператыўны цэнтр па працаўладкаванні моладзі, працуе гарачая лінія.**




Штодня з 9 да 18 гадзін па нумарах 8 017 284 85 54; + 375 25 964 09 67 кожны ахвотны можа атрымаць кансультацыю аб магчымасці працаўладкавання, а з 8 да 21 гадзіны звярнуцца ў аператыўны цэнтр (Кісялёва, 24) па гэтых нумарах асабіста.

А яшчэ днямі Мінскі гарадскі камітэт БРСМ правёў кірмаш вакансій «Праца — Крута!», на які былі запрошаны больш за 200 маладых людзей. Вядучыя прадпрыемствы сталіцы — ААТ «МАЗ», «Амкадор», «Камволь», Белгідрамет, ЗТАА «БелМаркетКомпані», ЗАТ «Атлант», ААТ «Авіякампанія «Белавія», Нацыянальная бібліятэка Беларусі, ААТ «Мінскі вагонарамонтны завод» — прапанавалі для моладзі працоўныя месцы. Іх спецыялісты не толькі адказвалі на пытанні, але і былі гатовыя выдаць ліст-накіраванне для працаўладкавання на прадпрыемстве.

На кірмашы вакансій прэзентавалі новую IT-распрацоўку актывістаў Саюза моладзі з БДУІР — мабільную праграму «Праца — Крута!». Гэта сумесны праект сталічнага БРСМ і Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама. Галоўная яго мэта — аказанне дапамогі ў працаўладкаванні моладзі. Першапачаткова праграма будзе працаваць на прыладах сістэмы Android, а ў будучыні стане даступная для прылад сістэмы iOS.

Плануецца, што база даных мабільнай праграмы «Праца — Крута!» будзе абнаўляцца адначасова са з'яўленнем новых вакансій у камітэце.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Галасы маладых

# Ці выйдзе сёння Муза ў інтэрнэт?

**Пытанне, куды рухацца літаратуры і як знайсці чытача, з разраду вечных. Маладыя беларускія літаратары разам са старэйшымі калегамі па творчасці, выкладчыкамі БДУ, рэдактарамі рэспубліканскіх друкаваных выданняў, журналістамі і студэнтамі спрабавалі вызначыць, як не стаць «мёртвым» пры жыцці, дзе шукаць папулярнасць і што прымушае чытача засынаць над творамі.**

Наогул, літаратура ўсё больш трансфармуецца і адыходзіць ад традыцыйных сюжэтаў. Студэнты з задавальненнем чытаюць нон-фікшн — прозу на мяжы з дакументам. Так, Андрусь Горват пачынаў сваё «Радзіва «Прудок» фактычна з запісаў у «Фэйсбуку», але гэтыя пасты аказаліся настолькі цікавымі, што былі аформлены асобнай кнігай, і Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы нават рыхтуе пастаноўку па матывах твора.

Пазнаць аўтара «ў твар» для сучаснага чытача становіцца праблемай. З Андрэем Хадановічам, паэтам і выкладчыкам БДУ, якраз здарыўся выпадак, які можна лічыць узорам стэрэатыпу «беларускі літаратар — «мёртвы» літаратар».

— Мая сваячка працуе намеснікам дырэктара ў агульнаадукацыйнай школе. Аднойчы там праходзіў урок пазакласнай літаратуры, вучні на памяць чыталі вершы. І вось хлопчык выбраў для дэкламацыі некалькі маіх лімерыкаў. Настаўніца задае пытанне «на дзясятку»: «Раскажаш штонебудзь з біяграфіі аўтара?» Хлапчук патыліцу пачухаў: «Ну, яго, здаецца, у 1937-м расстралялі...»

**Сёння беларускаму маладому пісьменніку патрэбна праскочыць паміж дзвюма пачварамі — Маніяй Велічы і Комплексам Непаўнавартасці.**

Дарэчы, на фоне астатніх жанраў паэзія якраз пажывае някепска. Гэтаму спрыяе невялікі аб'ём твораў. Верш добра выглядае на старонцы аўтара ў «ЖЖ», «Фэйсбуку» ці нават «УКантакце», а вось пад прозай які-небудзь жартаўнік можа пакінуць каментарый «не дачытаў, многа букаф».

Насамрэч, інтэрнэт-прастора дае аўтарам і чытачам мноства асаблівых магчымасцяў. Напрыклад, слухаць аўдыякнігі ў выкананні артыстаў або нават самога пісьменніка. Літрадыё.бай — гэта інтэрнэт-старонка з аўдыязапісамі галасоў беларускіх класікаў, якія чытаюць творы. Калі ж набраць у пошукавіку запыт «чорна-белыя вершы», то сістэма скіруе на некалькі дзясяткаў відэаролікаў на «Ютубе», дзе можна пачуць і пабачыць творы ў выкананні сучасных аўтараў.

У электронны фармат пераходзіць услед за літаратурай і крытыка. У сеціва перамяшчаюцца не толькі дыскусіі пра асобныя творы, але і размовы пра літаратурна-крытычны працэс наогул. Такім чынам маем у свабодным доступе як экспертнае, так і карыстальніцкае меркаванне. Не след забывацца і пра спрэчку паміж экспертнай крытыкай і «літ-журналістыкай». Апошняя аддае перавагу жанрам, дзе галоўнае паказаць сябе, нават калі ад гэтага церпіць інфарматыўнасць. Сам жа аб'ект аналізу адыходзіць на другі план.

З-за таго, што на семінары сабраліся маладыя літаратары, выступоўцы не прамінулі даць некалькі парад з уласнага вопыту. Так, старэйшае пакаленне лічыць, што сёння беларускаму маладому пісьменніку патрэбна праскочыць паміж дзвюма пачварамі — Маніяй Велічы і Комплексам Непаўнавартасці. Найлепшая зброя супраць першай — чытанне многіх аўтараў у арыгінале і ў перакладзе. Толькі так ёсць шанц выпрацаваць добры густ і шырокі літаратурны кругагляд. Яшчэ будзе нялішнім, калі аўтар «выхавае» ў сабе гіпатэтычнага чытача — гэта ўменне паглядзець на работу не з пазіцыі творцы, а як староннаму назіральніку. Што датычыцца аўтарскай сарамлівасці і нежадання выходзіць на публіку, то тут маладыя пісьменнікі і сталыя літаратары сышліся ў меркаваннях. Як бы ні было страшна выносіць свой першы рукапіс на суд чытачоў, зрабіць гэта неабходна. Бяда, калі малады пісьменнік закрываецца ў сабе, як смоўж у ракавіне, бо сёння ёсць магчымасць вучыцца літаратурнаму майстэрству разам.

— Раю маладым пісьменнікам збірацца разам не толькі на падобных семінарах, — прапанаваў прысутным **галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар ШНІП.** — Збірайцеся з аднадумцамі, прыносьце на сустрэчы свае творы, абмяркоўвайце іх з сябрамі. Па-добраму спрачайцеся, крытыкуйце і не забывайцеся зазіраць у рэдакцыі літаратурных выданняў. Гэта шанц атрымаць прафесійную параду, разабраць памылкі і выйсці да аўдыторыі праз друк.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**




**З сённяшняга нумара «Чырвонка. Чырвоная змена» пачынае друкаваць найлепшыя работы юных і маладых нештатных аўтараў, што паступілі на наш традыцыйны творчы конкурс. Найперш хочацца адзначыць, што сярод прэтэндэнтаў на перамогу прыемна бачыць ужо знаёмыя прозвішчы, з іншага боку, радуюць новыя актыўныя ігракі журналісцкага спаборніцтва. Разам з тым мусім канстатаваць, што некаторыя ўдзельнікі конкурсу або няправільна зразумелі яго тэму, або не здолелі яе раскрыць у сваіх «пробах пяра»... Але час наверстаць упушчанае яшчэ ёсць! Нагадаем, што з умовамі правядзення нашага творчага спаборніцтва можна азнаёміцца ў «Чырвонцы. Чырвонай змене» ад 14 верасня 2017 года або на сайце «Звязды» ў раздзеле «Праекты». Далучайцеся, юнкары!**

# ХЛОПЦЫ, НЕ ТРЭБА!

**У ноч на першага верасня васямнаццацігадовы жыхар горада скончыў жыццё самагубствам, кінуўшыся пад колы цягніка...**
**Мой знаёмы...**
**Прычыны такога кроку называліся розныя: ад нешчаслівага кахання да праблем з навучаннем ва ўніверсітэце...**

### ❍ ПРА АЎТАРА

**Паліне — 18 гадоў, сёлета яна заканчвае каледж. Што да мар дзяўчыны...**

**— Самая галоўная — паступіць ва ўніверсітэт, атрымаць добрую адукацыю і займацца ў жыцці любімай справай, — кажа аўтарка. — Яшчэ мне хацелася б шмат вандраваць, пабачыць на свае вочы ўсе цудоўныя куткі свету. У прыватнасці, возера Байкал. Завітаць на фестываль «Бёрнінг мэн», які штогод ладзіцца ў пустыні Невада. Хацела б пабываць на кожным канцэрце тура сваіх любімых выканаўцаў — у розных гарадах і краінах. А ўвогуле мая мара — быць шчаслівай. Прачынацца штодня з усведамленнем таго, што жыву нездарма. Хацелася б пакінуць на зямлі частцінку сябе — ці то твор, які будуць чытаць шмат пакаленняў нашчадкаў, ці то дзіця, выхаванае ў адпаведнасці з маімі маральнымі прынцыпамі...**

Трэба сказаць, што ў нашым маленькім горадзе, які перасечаны чыгункай на дзве часткі, з пачатку лета гэта быў ужо чацвёрты выпадак, калі маладыя гінулі пад коламі цягніка — нехта праз уласнае глупства, хтосьці — з-за недарэчнай бравады, а іншыя вось так, як мой знаёмы, спецыяльна зводзячы рахункі з жыццём.

Аб колькіх яшчэ трагедыях юнакоў, маіх землякоў, якія вырашылі добраахвотна пакінуць нас, мне даводзілася чуць за сваё не вельмі доўгае жыццё?! Аб шматлікіх...

Страшна...

Я думаю: што павінна адбывацца ў душы маладога чалавека, які і пажыць яшчэ не паспеў, каб ён вырашыў, што выхаду для яго ўжо не засталося? Упэўнена, усё ў гэтым свеце можна выправіць, акрамя смерці.

Хлопцы, не трэба!

Падумайце, а як жа бацькі? Доўгія-доўгія гады яны будуць вінаваціць сябе, што не апынуліся побач у адказны момант, не змаглі зберагчы вас ад апошняга кроку. Для іх назаўсёды жыццё падзеліцца на «да» і «пасля».

А як жа браты і сястрычкі, якія не змогуць уразумець і прыняць тое, што вы больш ніколі не прыйдзеце ім на дапамогу? Іх жыццё, як і жыццё бацькоў, таксама ніколі не стане ўжо такім, як раней.

А як жа другая палавінка, наканаваная вам? Яна так і не здолее стаць цэлай, застанецца сам-насам. Альбо будзе пакутаваць усё жыццё, праводзячы яго не з тым чалавекам...

А як жа тая справа, у якой вы маглі б стаць сапраўдным майстрам? Тыя каштоўнасці для чалавецтва, што маглі б быць зроблены вашымі рукамі і вышуканыя вашым розумам?

А як жа мільёны чароўных месцаў на нашай цудоўнай планеце, якія так і не дачакаюцца вас?

Хлопцы павінны быць дужымі... Хлопцы не плачуць...

Але!

Гэта не слабасць — трошкі паплакаць, нават для юнака.

Слёзы часам ачышчаюць душу.

Гэта не слабасць — абмяркоўваць з блізкімі свае праблемы.

Гэта не слабасць — праводзіць больш часу са сваімі сябрамі, ратуючыся ад самоты. Бо менавіта яны, знаходзячыся з вамі на адной хвалі, скажуць тыя словы, якія вы хочаце пачуць.

І памятайце пра тое, што чалавечае жыццё ўладкавана такім чынам, што ўсё ў ім цячэ і змяняецца, нібы ў водах хуткай ракі. І тое, што здавалася непераадольным сёння, заўтра падасца вам няважным і смешным.

Паверце.

Я правярала...

**Паліна ПРАКАПЕНЯ,**
**навучэнка III курса лінгвістычнага каледжа — філіяла Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта.**

# У ЧЫМ ЁН, ЦЯЖАР САПРАЎДНАГА ЛІДАРСТВА?

### ❍ ПРА АЎТАРА

**— Я вельмі актыўная, мне цяжка ўседзець на месцы. Стараюся развівацца творча і дзейнічаць у розных кірунках, каб знайсці для сябе самае цікавае, — расказала 17-гадовая аўтарка. — Паспрабаваўшы сябе ў многіх сферах, я спынілася на журналістыцы. І ў цяперашні момант маім жыццёвым дэвізам сталі словы Како Шанэль: «Усё ў нашых руках, таму іх нельга апускаць».**

**Застаецца толькі дадаць, што Надзея мэтанакіравана ідзе да сваёй мары: летась яна таксама ўдзельнічала ў нашым творчым конкурсе, яе работа была апублікавана.**

**— Святло, камера, матор! Акцёры па чарзе ўваходзяць у кадр і прамаўляюць свае рэплікі. Вакол віруе творчая атмасфера. У самым разгары работа над сацыяльным ролікам на экалагічную тэму ў Маладзечанскім цэнтры творчасці дзяцей і моладзі «Маладзік». Арганізатарам здымачнага працэсу і аўтарам ідэі сюжэта стаў старшыня маладзёжнага парламента горада Мікіта Андрыевіч.**

Правядзенне сацыяльных акцый, трэнінгавых заняткаў, культурна-масавых мерапрыемстваў на цікавыя для моладзі тэмы — яго стыхія. Не дзіўна, што менавіта гэты ініцыятыўны і творчы юнак прадстаўляў наш раён на сустрэчы кіраўніка дзяржавы з лідарамі дзіцячых і маладзёжных аб'яднанняў «Моладзь. Погляд у будучыню». На самым высокім узроўні абмяркоўваліся ўсё, што хвалюе хлопцаў і дзяўчат: ад навучальнага працэсу, раскладу заняткаў, новых падручнікаў з «ажываючымі малюнкамі» да асабістых планаў і ўспрымання сучаснага свету. Як адзначыў Мікіта, гэта быў адзін з самых запамінальных эпізодаў у яго жыцці: «Размова атрымалася адкрытай і душэўнай. Вядома, усе хваляваліся, але не разгубіліся, бо бачылі ў асобе кіраўніка дзяржавы найперш старэйшага сябра».

Цікавым і карысным для ўдзельнікаў маладзёжнага форуму стаў майстар-клас па развіцці лідарскіх якасцяў, творчых здольнасцяў і крэатыўнага мыслення. «Галоўнае, што я вынес з гэтай сустрэчы, што лідар — не той, хто знаходзіцца зверху. Бос — гэта той, хто сядзіць на камені, а падначаленыя яго цягнуць. А лідар — той, хто цягне камень разам з іншымі», — падзяліўся сваімі думкамі Мікіта.

Юныя парламентарыі разам распрацоўваюць план мерапрыемстваў, каб дапамагчы гораду стаць больш добразычлівым да дзяцей. Яны супрацоўнічаюць з прадстаўнікамі мясцовых улад і грамадскіх арганізацый, праводзяць навучальныя і матывавальныя заняткі з элементамі трэнінгу па метадыцы «Роўны навучае роўнага», акцыі ва ўстановах адукацыі, культуры, арганізуюць вольны час дзяцей і моладзі, ствараюць і распаўсюджваюць агітацыйны матэрыял на сацыяльна значныя тэмы. Напрыклад, да Сусветнага дня міласэрнасці парламентарыі правялі акцыю па прафілактыцы дарожнага траўматызму для выхаванцаў школы-інтэрната, заняткі па бяспечных паводзінах на вуліцах, а таксама тэматычную віктарыну.

Падчас летніх канікулаў члены каардынацыйнага савета маладзёжных парламентаў Беларусі сустракаліся з аўтарамі школьных падручнікаў і выказалі свае ідэі па іх удасканаленні. Усе вы памятаеце школьныя задачкі па матэматыцы, дзе з пункта А ў пункт Б адпраўляецца які-небудзь транспарт. «Больш цікава і пазнавальна рашаць задачы на прыкладзе канкрэтных гарадоў. Знайшоў адказ і даведаўся, што ад Мінска да Смаленска 330 кіламет-


Мікіта АНДРЫЕВІЧ задае пытанне Аляксандру Лукашэнку.

раў», — прапанавалі парламентарыі. І ўжо ў верасні, адкрыўшы новыя падручнікі, школьнікі з радасцю ўбачылі, што аўтары прыслухаліся да гэтай ідэі. А ў будучыні на старонках падручнікаў з'явяцца QR-коды, аб якіх таксама ішла размова на сустрэчы. Калі навесці на іх камеру тэлефона, можна, напрыклад, убачыць будову клеткі расліны ў фармаце 3D. Выдатна!

татніх, яны такія ж, як і мы — класныя, вясёлыя і стыльныя».

Самым яркім успамінам юнага парламентарыя стаў майстар-клас па вырабе калядных вянкоў для выхаванцаў Цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі. Цыкл «Роўныя магчымасці» скіраваны на сацыялізацыю дзяцей з інваліднасцю. «Не скажу, што працаваць было лёгка, але менавіта ў нефармальнай абстаноўцы, у працэсе жывых стасункаў мы вучымся талерантнаму стаўленню да людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Размаўлялі на самыя розныя тэмы, а калі развітваліся, нас не хацелі адпускаць», — успамінае Мікіта.

Валанцёрскі праект «Свет дабра», які рэалізуецца маладзёжным парламентам горада, быў адзначаны ў абласным конкурсе маладзёжных ініцыятыў. Але займаюцца гэтым падлеткі не дзеля ўзнагарод. «Калі мы бачым усмешкі дзяцей, то разумеем, што нашы намаганні не марныя. Людзі, у якіх ёсць цяжкасці ў жыцці, праблемы са здароўем, нягледзячы ні на што, умеюць усміхацца. Дык чаму мы заўсёды ўсім незадаволеныя, чаму не ўмеем радавацца звычайным рэчам, не можам успрымаць жыццё больш прос-


Майстар-клас «Роўныя магчымасці».

Парламентарыі працуюць і ў такім кірунку, як прапаганда здаровага ладу жыцця. Яны праводзяць спартыўныя спаборніцтвы, акцыі-канцэрты, флэшмобы па прафілактыцы ВІЧ-інфекцыі, алкагалізму і курэння, у даступнай форме паказваюць аднагодкам спосабы вырашэння гэтых сур'ёзных праблем. «Імкнёмся дапамагаць тым, хто спатыкнуўся, дзецям, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы і на ўліку ў інспекцыі па справах непаўналетніх», — расказвае юнак.

Вельмі важна, каб школьнікі з розных класаў, устаноў, сацыяльных груп маглі ў нефармальнай абстаноўцы пагутарыць з аднагодкамі, падзяліцца сваімі планамі і жаданнямі. Асабліва важныя такія стасункі для хлопчыкаў і дзяўчынак з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. «Мы хочам, каб кожнаму дзіцяці было камфортна жыць у горадзе. Мы ўсе роўныя, таму ва ўсіх павінны быць аднолькавыя правы і магчымасці, — сцвярджае малады чалавек. — Мы не вылучаем дзяцей з асаблівасцямі развіцця сярод ас-

та, як нешта светлае?!» — задаецца пытаннем юнак.

Каму, як не сённяшнім хлопцам і дзяўчатам, вырашаць лёс краіны ў будучыні. На нядаўняй сустрэчы з творчай моладдзю Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Ваша роля ў жыцці краіны высокая і адказная. Вашымі памкненнямі, марамі і, упэўнены, добрымі справамі Беларусь будзе жыць заўтра». Гэта разумеюць прадстаўнікі ўлад горада і ўсяляк падтрымліваюць ініцыятывы і пачынанні юных парламентарыяў. Нядаўна яны нароўні з дарослымі прынялі ўдзел у пасяджэнні каардынацыйнага Савета грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый, расказалі аб рэалізацыі міжнароднай ініцыятывы «Горад, дружалюбны да дзяцей». Такія сустрэчы даюць магчымасць прыцягнуць творчы патэнцыял моладзі да ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці горада і рыхтуюць маладое пакаленне да грамадскай дзейнасці.

**Надзея БОБРЫК,**
**вучаніца 11 класа гімназіі № 7 г. Маладзечна.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ, проводимом Ивацевичским райисполкомом на право добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства длиннопалого (узкопалого) рака (Astacus leptodactylus)

| Наименование предмета аукциона, местонахождение, площадь лота | Право на добычу, заготовку и (или) закупку длиннопалого (узкопалого) рака (Astacus leptodactylus) | | |
|---|---|---|---|
| | **лот 1** | **лот 2** | **лот 3** |
| | **пруд Коссово,** площадь 19,6 га | **водохранилище Гоща,** площадь 66,5 га | **водный объект Журавец,** площадь 154,2 га |
| Предельно допустимый объем вылова в год, кг | 211,7 | 718,2 | 1260 |
| Организатор аукциона | Ивацевичский районный исполнительный комитет | | |
| Начальная цена каждого лота, руб. | 490 | 490 | 490 |
| Сумма задатка, руб. | 245 | 245 | 245 |
| Срок предоставления права на добычу, заготовку и (или) закупку узкопалого рака | 5 лет | | |
| Условия, при которых право на добычу, заготовку и (или) закупку узкопалого рака предоставляется | Информировать Ивацевичскую районную инспекцию природных ресурсов и охраны окружающей среды о начале заготовки и (или) добычи ежегодно.<br>В течение одного года со дня принятия решения о предоставлении указанного права обеспечить разработку биологического обоснования Осуществлять обязанности, предусмотренные Правилами добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, утвержденными постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. № 699 | | |
| Предоставляемые документы | Заявление об участии в торгах на предоставление права на добычу, заготовку и (или) закупку длиннопалого (узкопалого) рака (Astacus leptodactylus) с указанием на какой территории и какие виды диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, предполагается заготавливать и (или) закупать;<br>Заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение суммы задатка;<br>Юридическими лицами – резидентами Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;<br>Индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию;<br>Юридическими лицами – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;<br>Представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность, (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя | | |
| Условия проведения аукциона | К участию в аукционе допускаются юридические лица и индивидуальные предприниматели.<br>Победитель аукциона возмещает организатору затраты, связанные с его организацией и проведением | | |

Задаток вносится на расчетный счет райисполкома BY72AKBB36411006500341300000 в ЦБУ №111 филиала № 802 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21802 , получатель – райисполком, УНН 200100489. Наименование платежа: «Задаток за участие в открытом аукционе на право добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства (узкопалого рака)», назначение платежа 04616. Срок внесения платежа – до подачи заявления на участие в аукционе. Внесение задатка и окончательный расчет осуществляются только в безналичной форме.

Дата проведения торгов **10 мая 2018 г.** в **15 00** по адресу: г. Ивацевичи, ул. Ленина, 44 (здание райисполкома), каб. 106.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 225291, Брестская область, г. Ивацевичи, ул. Ленина, 44, каб. 210 с 8.00 до 17.00 (перерыв с 13.00 до 14.00) в рабочие дни по **2 мая 2018 г.** включительно.

Порядок оформления участия и проведения аукциона определен Правилами добычи, заготовки и (или) закупки диких животных, не относящихся к объектам охоты и рыболовства, утвержденными постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. № 699.

После получения заявления с приложением необходимых документов участнику торгов выдается билет участника торгов с указанием даты регистрации заявления и порядкового номера, под которым юридическое лицо или индивидуальный предприниматель будет участвовать в торгах. Данные о каждом участнике торгов заносятся в книгу регистрации участников торгов.

Перед началом торгов его участники обязаны зарегистрироваться и обменять билет участника торгов на порядковый номер, подлежащий возврату после окончания торгов.

Аукцион проводится методом повышения начальной цены предмета аукциона.

Дополнительную информацию можно получить по телефонам: (8 01645) 9 25 42, 9 10 88

Центр Промышленной Оценки
- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

| Извещение о проведении повторного аукциона | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Завод «Легмаш», Витебская обл., г. Орша, Восточный переулок, 17 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общ. пл. | Инв. номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| **Здание корпуса № 5** | Здание специализированное иного назначения | 2435,4 кв. м | 240/С-44870 | Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, пер. Восточный 2-й, 21 |

| | |
|---|---|
| **Составные части и принадлежности** | крыльцо(а) |
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок общ. пл. 0,2924 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания корпуса № 5.<br>Ограничения (обременения) прав на земельный участок: охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, площадь 0,0238 га; зона санитарной охраны водных объектов, используемых для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зонах санитарной охраны в местах водозабора, площадь 0,2924 га |

**Обременения:** аренда. Подробная информация на сайте организатора аукциона www.cpo.by

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **169 600,57 белорусских рублей (снижена на 50 %)** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.03.2018

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **18.04.2018** в 13.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **13.04.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

## «Годовой отчет эмитента ценных бумаг за 2017 год»

**Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск» (ОАО «ДСТ-1, г. Витебск»)**
**Адрес:** 210026, Республика Беларусь, г. Витебск, ул. Суворова, 16, тел./факс 8 0212 67-21-15, УНП 300000398.
**Генеральный директор:** Капцевич Олег Вадимович
**Главный бухгалтер:** Лавренюк Людмила Петровна

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2017 года

тыс. руб.

| Активы | Код строки | На 31 декабря 2017 года | На 31 декабря 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** Основные средства | 110 | 16 117 | 17 279 |
| Нематериальные активы | 120 | 3 | 9 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 5 | 12 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 1 | 277 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | 491 | 401 |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | - | - |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **16 617** | **17 978** |
| **I I. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** Запасы | 210 | 6371 | 4920 |
| в том числе: материалы | 211 | 3865 | 3993 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | 2444 | 888 |
| готовая продукция и товары | 214 | 62 | 39 |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 56 | 2570 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 537 | 485 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 7327 | 5441 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 206 | 206 |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 4785 | 5349 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 1 | 1 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **19 283** | **18 972** |
| **БАЛАНС** | **300** | **35 900** | **36 950** |
| **Собственный капитал и обязательства** | **Код строки** | **На 31 декабря 2017 года** | **На 31 декабря 2016 года** |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** Уставный капитал | 410 | 2909 | 2909 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном фонде) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | 182 | 182 |
| Добавочный капитал | 450 | 16 643 | 16 807 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 5783 | 5373 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **25 517** | **25 271** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 233 | 249 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | 1799 | 1235 |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | - | - |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **2032** | **1484** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 3518 | 832 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 8 | - |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 4185 | 3946 |
| в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 1816 | 1735 |
| по авансам полученным | 632 | 376 | 615 |
| по налогам и сборам | 633 | 337 | 156 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 199 | 165 |
| по оплате труда | 635 | 424 | 368 |
| по лизинговым платежам | 636 | 915 | 836 |
| собственнику имущества (учредителям, участникам)у | 637 | - | 19 |
| прочим кредиторам | 638 | 118 | 52 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | 640 | 5417 |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **8351** | **10 195** |
| **БАЛАНС** | **700** | **35 900** | **36 950** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2017 года

тыс. руб.

| Наименование показателей | Код строки | За январь – декабрь 2017 года | За январь – декабрь 2016 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 47 534 | 58 390 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (42 016) | (50 835) |
| Валовая прибыль | 030 | 5518 | 7555 |
| Управленческие расходы | 040 | (4928) | (5133) |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| **Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг** | **060** | 590 | 2 422 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 3432 | 13 883 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (5154) | (15 324) |
| **Прибыль (убыток) от текущей деятельности** | **090** | (1132) | 981 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 523 | 731 |
| в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | 373 | 167 |
| доходы от участия в уставных капиталах других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 149 | 561 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | 1 | 3 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (399) | (262) |
| в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | (399) | (262) |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | - | - |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 5470 | 4636 |
| в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 5470 | 4636 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (3763) | (4686) |
| в том числе: проценты к уплате | 131 | (342) | (233) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (3108) | (4132) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | (313) | (321) |
| **Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности** | **140** | 1 831 | 419 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | 699 | 1 400 |
| Налог на прибыль | 160 | (699) | (560) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (5) | (4) |
| **Чистая прибыль (убыток)** | **210** | 25 | 836 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемых в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | 1662 |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | (322) | - |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | (297) | 2 498 |

| | |
|---|---|
| **Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %)** | 0 |

### Информация о дивидендах и акциях

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 1010 | 1009 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 1 | 1 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 0 | 0 |
| в том числе: физических лиц | лиц | 1009 | 1008 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 3 | 3 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 162,72 | 796,87 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 167,33 | 649,02 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,036356 | 0,178039 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) | рублей | 0 | 0 |
| типа___________ | рублей | 0 | 0 |
| типа___________ | рублей | 0 | 0 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,037385 | 0,145006 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) | рублей | 0 | 0 |
| типа___________ | рублей | 0 | 0 |
| типа___________ | рублей | 0 | 0 |
| Период, за который выплачивались дивиденды | месяц, квартал, год | 9 месяцев | х |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | 25.10.2017 | х |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | 22.11.2017 | х |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 5,70 | 5,69 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества, всего | штук | 0 | 0 |
| В том числе: поступившие в распоряжение общества | штук | 0 | 0 |
| приобретенные в целях сокращения общего количества акций | штук | 0 | 0 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Среднесписочная численность работающих | человек | 824 | 868 |
| Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено 20 и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг | строительство и ремонт автомобильных дорог | | |
| Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждены годовой бухгалтерский баланс за отчетный год | 28 марта 2018 года | | |
| Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения | частично применяется | | |
| Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сета Интернет | www.dst1.by | | |

Аудиторская организация: ООО «РСМ Бел Аудит». Местонахождение: Республика Беларусь, 220100, г. Минск, ул. Сурганова, 61, оф. 409. Государственная регистрация: Свидетельство № 190606685 от 02.06.2015 Мингорисполкома, УНП 190606685.

### Аудиторское заключение по бухгалтерской отчетности ОАО «ДСТ-1, г. Витебск» за период январь – декабрь 2017 года

…Годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «ДСТ-1, г. Витебск» по состоянию на 31 декабря 2017 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за 2017 год в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**Генеральный директор** **О. В. Капцевич**

**Главный бухгалтер** **Л. П. Лавренюк**

**28 марта 2018 года**

**ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ**
**Открытое акционерное общество «Стройтрест № 1»**
**220034, г. Минск, ул. Платонова, 15.**
**УНП 100288960**

**Бухгалтерский баланс на 31 декабря 2017 года**

тыс. руб.

| Наименование показателя | Код стр. | На 31 декабря 2017 года | На 31 декабря 2016 года |
|---|---|---|---|
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 8912 | 9684 |
| Нематериальные активы | 120 | 30 | 7 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 40 | 59 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | 216 | |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | 130 | |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **9328** | **9750** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 20 287 | 15 221 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 98 | 391 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 2633 | 363 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 59 106 | 33 801 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 8374 | 10704 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 16 | 17 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **90 514** | **60 497** |
| **БАЛАНС** | **300** | **99 842** | **70 247** |
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 378 | 378 |
| Добавочный капитал | 450 | 8376 | 8554 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 15 795 | 15 247 |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **24 549** | **24 179** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 0 | 0 |
| Долгосрочные обязательства по лизинг. платежам | 520 | 0 | 0 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **0** | **0** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 2496 | 0 |
| Кредиторская задолженность | 630 | 72 797 | 46 082 |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **75 293** | **46 068** |
| **БАЛАНС** | **700** | **99 842** | **70 247** |

**Отчет о прибылях и убытках за январь – декабрь 2017 г.**

| Наименование показателя | Код стр. | За январь – декабрь 2017 | За январь – декабрь 2016 |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 249 893 | 231 498 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 020 | 236 556 | 214 568 |
| Валовая прибыль | 030 | 13 337 | 16 930 |
| Управленческие расходы | 040 | 9272 | 8799 |
| Расходы на реализацию | 050 | 0 | 0 |
| Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 060 | 4065 | 8131 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 2434 | 5505 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | 140 | 191 | 241 |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | 1739 | 4101 |
| Совокупная прибыль | 240 | 1349 | 4099 |

**Информация о дивидендах и акциях**

| **4.** Доля государства в уставном фонде эмитента 94,91 (всего в %), в т. ч. | | |
|---|---|---|
| **Вид собственности** | **Кол-во акций, шт.** | **Доля в УФ, %** |
| коммунальная – всего: | 1 087 583 | 94,91 |
| городская | 1 087 583 | 94,91 |
| **5.** Количество акционеров – всего лиц | 445 | 445 |
| в т. ч.: юридических лиц | 1 | 1 |
| в т. ч.: физических лиц | 444 | 444 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | 1 | 1 |

| **6.** Информация о дивидендах и акциях | | | |
|---|---|---|---|
| **Наименование показателя** | **Ед. изм.** | **За отчетный период** | **За аналогичный период прошл. года** |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тыс. руб. | 1071,84 | 1362,2 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тыс. руб. | 1070,46 | 1358,12 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,940000 | 1,190000 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,930000 | 1,190000 |
| Период, за который выплачивались дивиденды | год | 2-е полугодие 2016 1-е полугодие 2017 | х |
| Дата принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | 27.03.2017 07.08.2017 | х |
| Срок выплаты дивидендов | число, месяц, год | до 22.04.2017 до 22.09.2017 | х |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | 21,42 | 21,09 |
| Кол-во простых акций, находящихся на балансе общества | штук | | |
| **8.** Среднесписочная численность работающих, человек | | 2818 | 2645 |

**9.** Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг: строительство – 96,1 %, прочее – 3,9 %.

**10.** Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный 2017 год: 26.03.2018 года.

**13.** Сведения о применении эмитентом правил корпоративного поведения: свод корпоративных правил одобрен Обществом и применяется в необходимой мере.

**14.** Адрес официального сайта ОАО в глобальной компьютерной сети Интернет: trest1.by

Годовая отчетность подтверждена аудиторским заключением ООО «Юнион-Аудит», УНП 192922380.

**Решением собрания выплата дивидендов за II полугодие 2017 осуществляться не будет.**

Генеральный директор В. А. Бублик

Главный бухгалтер А. Н. Мытник

# НЕ ТРАПІЦЬ НА ВУДУ КІБЕРЗЛАЧЫНЦАЎ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Ці бывае шкада тых, каго затрымліваеце?***

— Часцей за ўсё на махлярства штурхае адчуванне беспакаранасці. Шкада, канешне, калі хлопцы і дзяўчаты такім чынам псуюць сабе жыццё. Маўляў, «гэта чыста па прыколе, давай аплацім». Быў выпадак, калі студэнты аднаго са сталічных каледжаў убачылі, як у таварыша выпала з кішэні картка. Юнакі забралі яе і накупілі ласункаў, паклалі грошы сабе на тэлефоны.

***— А як жа пін-код?***

— У нас хапае грамадзян, якія захоўваюць паролі разам з карткай. Пішуць іх на паперцы! А яшчэ запаветныя лічбы могуць на зваротным баку карткі алоўкам ці маркерам пазначыць. Рай для зламысніка, пагадзіцеся. Грэх не скарыстацца!


Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Яўген Давідовіч за работай. Фатаграфаваць аператыўнікаў нельга, таму твар нашага ахоўніка ў сусвеце высокіх тэхналогій застанецца засакрэчаным.**

## Ірвануць насустрач будучыні

Яўген трапіў на службу ва ўнутраныя органы пасля заканчэння Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Будучы аператыўнік атрымаў адукацыю юрыста, але па спецыяльнасці працаваць не захацеў:

— Для мяне заўсёды было цікава паглядзець знутры і зразумець, што ж такое міліцыя. Год працаваў участковым інспектарам на малой радзіме, у Слуцку.

***— Усё ўбачылі?***

— Шмат чаго, — уздыхаючы, кажа Яўген. — Пасля пераеўся ў Мінск у аддзел крымінальнага вышуку. Адслужыў там чатыры гады.

Родныя Яўгена з «пагонамі» не звязаныя. Выбар хлопец рабіў сам.

— Чаму ў Слуцку не сядзелася? Жонка, а на той момант нявеста яшчэ, скончыла ўніверсітэт і ўзнікла пытанне, дзе знайсці добрую работу. У маленькім горадзе з гэтым складана. Вось і вырашылі пашукаць сваё шчасце ў сталіцы. Ірванулі! У той час нічога ў Слуцку не трымала. Вольга ўладкавалася ў банк.

***— Зараз адчуваеце сябе на сваім месцы? Ці паспрабавалі б нешта яшчэ?***

— Напэўна, затрымаюся тут. Але і як участковы, і супрацоўнік крымінальнага вышуку я адчуваў сябе карысным. Што датычыцца працоўнага графіка, то ён і там, і тут такі, што на сям'ю, на жаль, застаецца вельмі мала часу. Бывае, справа «зацягвае», забываешся нават на гадзіннік паглядзець! Але я вучуся ўсё сумяшчаць, — падсумоўвае суразмоўнік.

Цікава, але некаторыя знаёмыя Яўгена да гэтага часу дакладна не разумеюць, чым ён займаецца.

— А я і не спяшаюся тлумачыць. Працы мне хапае на службе. Па-за ёй на гэтыя тэмы не вельмі люблю размаўляць. Адзінае, магу сказаць, што экшэну дастаткова. І не сяджу я ўвесь час у кабінеце каля камп'ютара, як многім здаецца. Сабраць інфармацыю ад сведак, пацярпелых, банкаў або аператараў мабільнай сувязі — таксама мая работа.

Не магу прайсці міма «дзіўных» аб'яў у інтэрнэце. Напрыклад, калі прапануюць прадаць iPhone X за 500 долараў. Зразумела ж, што гэта нейкае махлярства. Перадаю інфармацыю калегам у крымінальны вышук. На гэтым мая «хатняя служба» заканчваецца, — жартуе міліцыянер.

## Новы кавалер або хакер?

— Памятайце, старонкі ў сацыяльных сетках узломваюць не проста дзеля забавы, — папярэджвае аператыўнік. — Зараз у «модзе» шантажыраваць інтымнымі фотаздымкамі.

Нядаўна быў выпадак, калі хлопец з дзяўчынай шукалі кватэру праз інтэрнэт. Адзін з карыстальнікаў сеткі даслаў ім асабістае паведамленне накшталт «Ці актуальна яшчэ жыллё? У мяне ёсць варыянт. Падрабязнасці па спасылцы». Маладыя перайшлі па ўказаным адрасе і атрымалі паведамленне аб тым, што іх старонка заблакаваная, а ўсе асабістыя фота пары скапіраваны. Для таго каб кадры не трапілі да знаёмых, у закаханых патрабавалі 50 долараў.

— Сума невялікая, скажаце вы. Дзеля спакою можна было б і не пашкадаваць? Але гарантыі, што пасля таго, як вы заплаціце, шантаж спыніцца — няма. Таму лепш напісаць заяву ў міліцыю, — раіць аператыўнік. — Папулярная некалькі гадоў таму схема з блакіроўкай мабільных тэлефонаў ужо, можна сказаць, «аджыла» сябе. Сёння зламыснікі ўзломваюць камп'ютары арганізацый, а затым шыфруюць усе файлы ўнікальнымі ключамі. І тут «за свабоду» таксама патрабуюць матэрыяльнае ўзнагароджанне. Гэта адзін з самых ходавых артыкулаў, справы па ім апошнім часам завозяцца вельмі часта. Бываюць выпадкі, калі былыя супрацоўнікі-праграмісты выкарыстоўваюць у асабістых мэтах карпаратыўную інфармацыю з свайго папярэдняга месца працы.

***— Калі маляваць агульны партрэт кіберзлачынца, які ён?***

— Гэта вельмі крэатыўныя людзі, — лічыць Яўген. — Тут не трэба быць таленавітым ад Бога праграмістам, галоўнае — жаданне і крыху фантазіі. Але гэтая фантазія караецца, не забывайцеся. Часта такія людзі ўваходзяць у злачынныя групы. Сярэдні ўзрост зламыснікаў — 14—30 гадоў. Пакаленне, якое развівалася разам з усімі гэтымі тэхналогіямі.

На жаль, катэгорыя такіх злачынстваў вельмі цяжка раскрываецца: большая іх частка здзяйсняецца з замежных IP-адрасоў.

***— А ахвяры, хто яны?***

— Часцей за ўсё гэта дзяўчаты. Махляры пішуць у такі час, калі чалавек вельмі чымсьці заняты: збіраецца ранкам на работу або, наадварот, толькі зайшоў стомлены дадому. Хакеры аналізуюць, капіруюць ваш стыль стасункаў, робяць кампліменты.

***— Як праверыць, піша мне злачынец або проста новы кавалер?***

— А ўсё проста! Прапануйце патэлефанаваць свайму віртуальнаму суразмоўніку. Калі гэта не жаніх, то вы адразу пачуеце штосьці накшталт «Я заняты, я не ў краіне, мне нязручна гаварыць».

## Служба — гэта стабільнасць

— За два гады на гэтай пасадзе так і не зразумеў, чаму людзі не берагуць свае персанальныя даныя. Я не кажу заклейваць пластырам камеры ноўтбукаў і не купляць «разумныя» тэлевізары, пыласосы. Ніхто за вамі адтуль не сочыць. Нічога жахлівага не адбудзецца, максімум яны збяруць інфармацыю аб вашым месцазнаходжанні і вашых інтарэсах. А вось над паролямі для старонак у сацсетках трэба задумацца. На жаль, карыстальнікі ігнаруюць верхні і ніжні рэгістр літар, лічбы, — кажа Яўген.

Хлопец смяецца, што некаторыя паролі для старонкі жонкі прыдумляў ён: «У сваіх ведах я ўпэўнены. Вольга мне таксама давярае».

— Да тэхнікі мяне заўсёды цягнула. Спачатку ўвогуле хацеў паступаць пасля 9 класа ў вышэйшы каледж сувязі, але нешта не складвалася з фізікай, — успамінае аператыўнік.

Сёння групе па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій крымінальнай міліцыі УУС адміністрацыі Маскоўскага раёна сталіцы работы хапае. Яўген кажа, што аддзел можна смела пашыраць.

**«Але памятае банк, па заяве якога пачынаецца расследаванне наконт знікнення фінансаў. Высвятляецца, што «самы мілы на свеце сын» аплачваў бацькоўскай карткай гульнявыя сайты».**

З кіберзлачыннасцю паспяхова змагаюцца і дзяўчыны. Спецыялісты пераходзяць у гэты аддзел з крымінальнага вышуку, з інспекцый па справах непаўналетніх.

— А вось жонка, напэўна, не справілася б тут, — разважае аператыўнік. — Вельмі эмацыянальная яна ў мяне. Можа расчуліцца падчас прагляду фільмаў і мульцікаў. А ў міліцыі трэба мець цвярозую галаву, нават калі гаворка ідзе пра дзяцей, — лічыць Яўген.

Увесь вольны час, якога вельмі мала, супрацоўнік праводзіць з сынам. На пытанне, а як жа шумныя кампаніі і клубы, хлопец адказвае проста: «Сваё я ўжо адтанцаваў».

***— Жадання пайсці ў IT-сферу ніколі не было?***

— Вядома, ні для кога не сакрэт, што праграміст зарабляе больш за міліцыянера. Але служба — гэта стабільнасць, а там — невядомасць, — упэўнены оперупаўнаважаны.

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
5 04 2018 г.

SEX=БАЛЯСЫ

# ПРА ШТО МАЎЧАЦЬ ЖАНЧЫНЫ?

**Памятаеце, у вядомым фільме герой Мела Гібсана ў выніку няшчаснага выпадку атрымаў магчымасць чытаць думкі жанчын? Але можна зрабіць і прасцей. Для гэтага трэба проста ўмець слухаць. І бачыць. Галоўнае — каго і дзе. Адзін брытанскі хлопец вырашыў тыдзень пажыць у жаночым інтэрнаце, каб даведацца ўсё, што хаваюць дзяўчаты за ідэальным фасадам сваёй знешнасці... Ну, па-першае, у гэтай гісторыі асабіста мяне адразу напружвае і выклікае недавер слова «ўсё». Хіба такое магчыма ў прынцыпе? Па-другое, «ён вырашыў пажыць»... Ды многія хлопцы проста мараць пра такое, але без шанцаў! («Добрая вахцёрша — галоўная прычына цяжарнасці дзяўчат у інтэрнаце».) Але бог з ім, як ён туды патрапіў. Нават калі гэтая навіна была фэйкавай, яе варта было б прыдумаць. Пагадзіцеся, дзяўчаты, мы ж штодня знаходзімся побач з вамі, назіраем, запамінаем, робім высновы... Але вернемся да эксперымента. На сваёй старонцы блогер апублікаваў «30 шакавальных і не вельмі рэчаў, якія ён даведаўся пра дзяўчат». Запіс стаў папулярным, набраў 230 тысяч лайкаў і 100 тысяч рэтвітаў. Што ж такога пачуў і ўбачыў хлопец? Аказваецца...**


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Напрыклад, калі дзяўчаты спрабуюць паводзіць сябе ціха, яны вырабляюць неверагодны шум гэтым сваім «Шшшшш». Гм... Калі ў маёй сям'і збіраецца разам больш за дзве жанчыны, не тое, што майго голасу ўжо не чуваць, я для іх перастаю існаваць увогуле за гэтым гамам! («Даказвала мужу, што ён не мае рацыі. Сарвала голас».)

Наступны пункт. У дзяўчат ашаламляльная колькасць розных слоічкаў, бляшанак, бутэлечак. Усё дзеля прыгажосці! («Павінна быць у жанчыне нейкая загадка. Скажам, прачынаешся ранкам. Глядзіш... Хто такая?!») Блогер піша, што іх тысячы і імі завалены ванны пакой, усе паліцы, сумкі і нават падлога. У нашай сям'і да апошняй справа яшчэ не дайшла, але з маёй паловы паліц рэчы нейк неўпрыкмет выціскаюць ужо даўно...

Усе дзяўчаты носяць адзенне адна адной і мяняюцца ім, як быццам увесь іх гардэроб — адзін вялікі бясплатны рынак. Зноў жа здзівіў, праўда? («Калі жанчына змагла перамераць усё, што ў яе ёсць, значыць, у яе нічога няма».) Я да таго, што такі «рынак» сапраўды можа быць для жанчыны бясплатным, але вялікім — апрыёры ніколі. («Жанчыны не любяць логіку, таму што з яе дапамогай цяжка растлумачыць мужу неабходнасць дзясятай пары туфляў».)

Блогера здзівіла, што дзяўчаты прыходзяць дадому такімі галоднымі, што гэта нейкі жах! Як ён напісаў: «Макарону з маянэзам? Давай, выдатна!» Тут я думаю, што хлопец проста здорава памыліўся. («Самая смачная яда — гэта астылая смажаная бульба, уначы, з патэльні, рукамі. Пакуль ніхто не бачыць!») Толькі паспрабуй адабраць! («Я худзею. — Даўно? — Амаль паўгадзіны. — Прыкметна ўжо. — Праўда? — Ага. Вочы галодныя».)

Кожны вечар дзяўчаты гаварылі свайму госцю час, калі яны планавалі выйсці з інтэрната. Блогер мусіў канстатаваць, што хутка зразумеў: каб даведацца рэальны час выхаду, неабходна дадаць да прызначанага яшчэ 2,5 гадзіны. («— Колькі табе ісці да яе? — Ну, дзесьці хвілін 40. — А калі вы пойдзеце адно аднаму насустрач? — Тады 40 хвілін ісці і яшчэ недзе гадзіну чакаць...»)

Падчас зборaў на вечарынкі хлопец дзясяткі разоў чуў фразу: «Божухна, я такая тлустая, што мне надзець?» («— Я памерала ўсё, у што ўлезла! — Ну і як? — Туфлі супер!») Чуць вы яе можаце, толькі не думайце вымаўляць самі... Вельмі раю... («Сёння мая дзяўчына сказала мне: «Добрай раніцы». А я адказаў: «Угу». У каго можна пераначаваць?»)

Далей у працяг тэмы брытанец піша так, нібы зрабіў адкрыццё стагоддзя. «Хлопцы, яны заўсёды будуць пераапранацца па некалькі разоў! Зрабіце сабе ласку і ідзіце паспіце. Думаеце, калі яна прымярае трэці строй, хутка будзе гатова? Ха!» («— Дарагі, мне якую сукенку выбраць? Гэтую ці гэтую? — (Не адрываючыся ад газеты) Ды быццам бы абедзве нічога. — А я не хачу выглядаць «быццам нічога». Я хачу выглядаць ашаламляльна! — Ну, тады надзень абедзве. Будзе ашаламляльна».)

Дзяўчаты пачынаюць пакаваць чамадан за 30 хвілін да таго, як трэба выязджаць, таму што палова рэчаў патрэбна ім кожную хвіліну... Я яшчэ дадам пра сваю. Калі пытаюся, чаму ў кватэры адначасова святло гарыць у ванным пакоі, калідоры, спальным пакоі і зале, нязменна чую ў адказ: «Таму, што я тут!»

У кожнай дзяўчыны ёсць дзве касметычкі. Адна са змесцівам, якое ім сапраўды ўвесь час патрэбнае, а другая не выкарыстоўваецца ніколі. У ёй шмат розных штук, да якіх яны нават не дакранаюцца, але якую заўсёды возяць з сабой. («Зрабіла генеральную ўборку ў сваёй сумачцы. Давялося два разы вядро са смеццем выносіць».)

...Спіс таго, пра што маўчаць жанчыны (ці пра што думаюць, што маўчаць), можна працягваць і далей. Кожны з мужчын абавязкова дадасць сваё. Толькі які ў гэтым сэнс, калі ты ведаеш галоўную іх таямніцу? «Дзяўчаты — самыя добрыя істоты на планеце. Яны могуць дараваць любому хлопцу, нават калі ён не вінаваты». Яны самі ў гэтым не прызнаюцца, прамаўчаць. Але ж мы пра гэта дакладна ведаем...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Першую сумку пашыў для жонкі»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Шыць, дарэчы, не ўмеў абсалютна. Дома стаяла старая швейная машынка, якая дрэнна працавала, з нажным прыводам, на ёй і практыкаваўся. Я не з першага разу правільна нітку ўставіў!

***— Чаму ў выніку спыніліся на сумках?***

— Так атрымалася, што пасля ўніверсітэта працаваў на складзе скуры ў Мінску, дзе адначасова была арганізавана і ручная вытворчасць. Там я даведаўся пра матэрыялы, абсталяванне, убачыў, як працаваць са скурай, бо дагэтуль не ўмеў.

***— З чаго пачыналі?***

— Спярша трэба было сумяшчаць хобі і асноўную работу, таму шыў сумкі на кухні ноччу. З суседзямі мне пашанцавала, не скардзіліся на шум. Працуючы на складзе, змог пазнаёміцца з нашымі вядомымі дызайнерамі. Потым знаёмы прапанаваў паўдзельнічаць у конкурсе. Мой эскіз у выніку прынялі, але сказалі, што ён быў выкананы горш за ўсіх *(усміхаецца)*. Пасля ў Мінску пачалі праводзіцца модныя маркеты (выстаўкі-кірмашы дызайнерскіх рэчаў. — **Аўт.**) — мяне туды запрасілі. А ў 2013 годзе я першы раз паўдзельнічаў у Беларускім тыдні моды.

***— Колькі доўжыцца працоўны дзень дызайнера?***

— Ён бясконцы! Бывае, паўночы не спіш, думаеш, як удасканаліць мадэль. У майстэрні я звычайна з раніцы і да шасці вечара. Больш не магу затрымлівацца: трэба паспець сына з дзіцячага садка забраць. Ён і так адным з апошніх застаецца.

Ва ўяўленні многіх работа дызайнера — як у фільме: намаляваў эскіз і пайшоў далей шукаць натхненне *(смяецца)*. Але насамрэч ты адначасова і дырэктар па вытворчасці, і маркетолаг, і тэхнолаг, і канструктар, і кантралёр якасці. Хочаш рабіць добра — даводзіцца разбірацца ва ўсім.

***— Як вырашаеце, якой будзе наступная сумка?***

